153. МОСКВА 14,
УЛ. ФРУНЗЕ 10 ИНСТИТУТ
СОВ. СТРОИТЕЛЬСТВА
И ПРАВА
1. 1.12.36

Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

# ЗВЯЗДА

Орган ЦК і МК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

№ 126 (5500)
ЧАЦВЕР
4
ЧЭРВЕНЯ
1936 г.
Год выдання XIX

ПРОЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

## СЁННЯ Ў НУМАРЫ:

КІРАЎНІКІ ПАРТЫІ І ЎРАДА НАВЕДАЛІ АСОБНЫ КАВАЛЕРЫЙСКІ ДЫВІЗІЁН.

**АБ РАБОЦЕ СЕЛЬСКІХ РЭВІЗІЙНЫХ КАМІСІЙ** — ПАСТАНОВА ПРЭЗІДЫУМА ЦВК БССР.

**АРТЫКУЛЫ: ПЕРАДАВЫ** — ЗА КУЛЬТУРНУЮ ДАРОГУ. ПРАФ. **Д. А. МАРКАЎ** — ТОРФАГРАЗЕЛЯЧЭННЕ Ў БССР. **Б. ЛЕВІНЧЫК** — ПРАВІЛЬНА РАЗМЕРКАВАЦЬ ПЛЕМЯННУЮ ЖЫВЁЛУ. **М. ФРУМКІН** — «ШТУРМЫ» НА АСІНТОРФЕ. **С. СЯМАШКА** — КАЛГАСНЫ ГАРАДОК.

АБМЕРКАВАННЕ ПРАЕКТУ ПАСТАНОВЫ ЦВК І СНК САЮЗА ССР. НА КУЛЬТУРНЫЯ ТЭМЫ.

ЗАЯВА ГР. МАТВЕЕВА КАРЭСПАНДЭНТУ ТАСС.

**ЗА РУБЯЖОМ:** ЯПОНСКАЯ АГРЭСІЯ Ў ПАЎНОЧНЫМ КІТАІ.

ЗАЯВА АБІСІНСКАГА НЕГУСА. СЯЛЯНСКІЯ ДЭМАНСТРАЦЫІ Ў ПОЛЬШЧЫ.

## КІРАЎНІКІ ПАРТЫІ І ЎРАДА НАВЕДАЛІ АСОБНЫ КАВАЛЕРЫЙСКІ ДЫВІЗІЁН

Учора, 2 чэрвеня, таварышы **Сталін, Молатаў, Варашылаў, Кагановіч, Орджанікідзе, Мікаян, Жданаў, Якаўлеў, Бауман, Філатаў, Рэдэнс, Гамарнік, Будзённы** і інш. наведалі асобны кавалерыйскі дывізіён наркамата абароны, дзе прысутнічалі на занятках, якія падводзілі вынікі зімняй падрыхтоўкі маладых байцоў перад выхадам іх у лагер.

Кіраўнікам партыі і ўрада былі паказаны страявая і спартыўная падрыхтоўка, вальтыжыроўка, джыгітоўка, валоданне халоднай зброяй і конкур-іппік.

Нарком абароны маршал Совецкага Саюза тав. **Варашылаў** аб'явіў падзяку ўсяму асабістаму складу дывізіёна за яго добрую работу. «Служым працоўнаму народу» — раласна і дружна адказалі байцы на словы свайго наркома.

Доўга не змаўкала поўнае захапленне «ўра» камандзіраў, палітработнікаў і байцоў дывізіёна, калі тав. **Варашылаў** агаласіў: «Няхай жыве наш вялікі **Сталін!**», «Няхай жыве таварыш **Молатаў**», «Няхай жывуць таварышы **Кагановіч, Орджанікідзе, Мікаян, Жданаў**».

## ЗА КУЛЬТУРНУЮ ДАРОГУ

Восень. Лье дождж. Разбітая, раз'езджаная, у глыбокіх калдобінах і рытвінах дарога. Застраўшыя ў адной з калдобін калёсы, якія, надрываючыся і грузнучы ў ліпкай, жоўтай гразі, ледзь цягне конь.

Хто не ведае сумнай карціны мінулага беларускага бездарожжа? Дарогі, па якіх нельга, як гаворыцца, ні прайсці, ні праехаць. Паламаныя масты...

Цяпер ужо няма гэтай сумнай карціны. Мы маем добрыя, культурныя магістральныя і раённыя дарогі, якія ў большасці ўтрымліваюцца ва ўзорным парадку.

Совецкая Беларусь у мінулым годзе вышла па дарожнаму будаўніцтву на адно з першых месц у Совецкім Саюзе.

Аднак на мясцовых дарогах яшчэ ў радзе раёнаў, да нашага сораму, можна і цяпер, асабліва ўвесну і ўвосень, сустрэць зусім непраезджыя ўчасткі, паламаныя масты, рытвіны, калдобіны, ухабы.

Добрая дарога з'яўляецца адной з важнейшых умоў для прамысловага ўзьдыму, для развіцця сельскай гаспадаркі, для разгортвання тавараабароту, для культурнага ўздыму ўсёй краіны. Выключнае значэнне маюць мясцовыя дарогі, у асабліваспі для калгасаў, для калгаснага сялянства. Гэтыя дарогі з'яўляюцца каналамі цеснай эканамічнай і культурнай сувязі гарадоў, раённых цэнтраў з кожным самым аддаленым калгасам.

Калгаснае сялянства добра разумее значэнне і велізарную карысць культурнай дарогі. І таму з года ў год расце ўдзел насельніцтва як у догляде за дарогамі, утрыманні іх, так і ў работах па дарожнаму і маставому будаўніцтву.

Мы маем у Беларусі асобныя ўчасткі мясцовых дарог, якія мала чым адрозніваюцца па свайму стану і ўтрыманню ад лепшых дарог рэспублікі. Мы маем нямала калгасаў, у якіх калгасная вуліца ўтрымліваецца ва ўзорным парадку, забрукавана, пракладзен па баках тратуар, пасаджаны дрэвы. Але яшчэ вельмі многа такіх дрэнных мясцовых дарог, дзе трэба прыкласці вялікую працу, каб прывесці іх у належны парадак, асабліва к восені. На іх і цяпер ламаюцца калёсы, калечацца коні, псуецца і знішчаецца калгаснае дабро.

Совецкая дзяржава ўкладвае велізарныя сродкі на дарожнае будаўніцтва. Калгаснае сялянства прымае, згодна закона, працоўны ўдзел у будаўніцтве і рамонце дарог.

Паміж асобнымі калгасамі і брыгадамі на дарожным будаўніцтве разгарнулася соцыялістычнае спаборніцтва, у разультаце якога мы маем узоры высокай прадукцыйнасці працы. У **Слуцкім** раёне брыгада калгаса «Комунар», Казловіцкага сельсавета (брыгадзір Васіль **Кахановіч**) выканала на 28 мая сваё заданне на 118 проц. У **Горацкім** раёне брыгада калгаса «Шлях соцыялізма» (Горацкага сельсовета) выконвае штодзенна заданне на 150—170 проц., а звяно Зосі **Новікавай** — на 230 проц. нормы. У **Веткаўскім** раёне ў брыгадзе калгаса «Прасвет» Марфа **Дзеравяшкіна** і Зіна **Вдовіна** выконваюць на 225 проц. норму па пракопцы канаў. У **Жлобінскім** раёне калгаснік Сяргей **Сафонаў** з калгаса «Араты», Стрэшанскага сельсавета выконвае 300 проц. нормы. На гэтых лепшых людзей — ударнікаў дарожнага будаўніцтва — павінны раўняцца ўсе калгаснікі, калгаснікі і калгасы Совецкай Беларусі. Імёны гэтых людзей павінна ведаць уся Совецкая Беларусь.

Задача партыйных раённых і совецкіх арганізацый — шырока папулярызаваць гэтых людзей, герояў дарожнага будаўніцтва, і выдатныя ўзоры іх работы, сістэматычна захвочваць іх, акружыць стаханаўцаў дарожнага будаўніцтва такімі-ж клопатамі, любоўю і ўвагай, якой мы акружаем лепшых стаханаўцаў паляводства і жывёлагадоўлі.

Лепшым доказам таго, якія велізарныя рэзультаты дае разгортванне соцыялістычнага спаборніцтва ў дарожным будаўніцтве, з'яўляецца **Бурнаўскі** сельсавет **Брагінскага** раёна. У гэтым сельсавеце ініцыятарам спаборніцтва на дарожным будаўніцтве быў брыгадзір калгаса «Чырвоны працаўнік», орэнаносец тав. **Кулай**, які ўступіў у спаборніцтва з брыгадай калгаса «Чырвоная ніва». На 28 мая Буркаўскі сельсавет выканаў гадавы план на 97 проц.

Мы маем усе магчымасці для таго, каб, разгарнуўшы соцыялістычнае спаборніцтва на дарожным будаўніцтве ў кожным раёне, сельсавеце і калгасе, **выканаць да 20 чэрвеня план працоўнага ўдзелу сельскага насельніцтва ў дарожным будаўніцтве і паспяхова закончыць усе дарожныя работы.** Гэту задачу неабходна паставіць у кожным раёне і таму, што пасля 20 чэрвеня разгорнецца поўным тэмпам сенаўборка і пасля — уборачная кампанія. У гэтым зацікаўлен і кожны калгас, бо, выканаўшы план свайго працоўнага ўдзелу ў дарожным будаўніцтве, калгаснікі могуць накіраваць усе сілы на сенаўборку і ўборку хлябоў.

На 1 чэрвеня ў радзе перадавых па дарожнаму будаўніцтву раёнаў БССР — **Церахаўскі, Жлобінскі, Дзяржынскі, Хойніцкі, Мозырскі, Жыткавіцкі і Грэскі** раёны. Ганебна адстаюць **Сенненскі** (апошняе месца па рэспубліцы), **Хоцімскі, Клімавіцкі, Багушэўскі, Бягомльскі, Смалявіцкі, Шкловскі і Прапойскі** раёны. Адставанне гэтых раёнаў тлумачыцца толькі адным: дарожным будаўніцтвам у гэтых раёнах партыйныя і совецкія арганізацыі не займаюцца, соцыялістычнае спаборніцтва па выкананню плана працоўнага ўдзелу насельніцтва не разгорнута, аб лепшых ударніках дарожнага будаўніцтва ў гэтых раёнах ніхто не ведае, аператыўнага кіраўніцтва гэтай важнейшай справай няма.

За дарожнае будаўніцтва зараз трэба моцна ўзяцца. Трэба памятаць, што зараз — найбольш зручны час для шырокага разгортвання і паспяховага завяршэння дарожных работ. Таму нельга ўпускаць ні аднаго дня.

## ПАРТЫЗАНСКАЯ ВАЙНА У АБІСІНІІ

БЕРЛІН, 2 чэрвеня. (БЕЛТА). Германскае інфармацыйнае бюро паведамляе з Джыбуці, што быўшы губернатар правінцыі Воло са сваім атралам (пайшоўшым у горы, каб прадаўжаць партызанскую барацьбу супроць італьянцаў) нечакана напаў на горад Дэсіе. Абісінцам удалося пры гэтым знішчыць на аэрадроме ў Дэсіе тры італьянскія бамбавозы.

Спецыяльны карэспандэнт «Фелькішэр беабахтэр», які знаходзіцца ў Адыс-Абебе, паведамляе, што барацьба абісінскіх паўстанцаў ў самой сталіцы прадаўжаецца і пасля заняцця горада італьянцамі. Да гэтага часу ў радзе дамоў забарыкаваны ўсе вокны.

## Аргентына патрабуе склікання пленума Лігі нацый

ЖЭНЕВА, 3 чэрвеня (БЕЛТА). Учора далегат Аргентыны наведаў генеральнага сакратара Лігі нацый і па даручэнню свайго ўрада перадаў ноту, якая пацвярджае яго вусную заяву ад 29 мая аб скліканні пленума Лігі нацый для разгляду становішча, створанага анексіяй Абісініі, і вынікаў санкцый.

У сакратарыяце Лігі нацый лічаць мачымым скліканне пленума Лігі нацый яшчэ ў чэрвені.

1 чэрвеня ў Цэнтральным парку культуры і адпачынку імя Горкага адкрываецца «Стаханаўскі павільён». НА ЗДЫМКУ: агульны выгляд новага павільёна.
Фото Б. Ігнатовіча (Саюзфото).

## ЗАЯВА гр. МАТВЕЕВА КАРЭСПАНДЭНТУ ТАСС

Гр. Ф. С. Матвееў (сведка па справе Антыкайнена), які вярнуўся з Гельсінгфорса 1 чэрвеня у Ленінград, у гутарцы з карэспандэнтам ТАСС заявіў наступнае:

«Ужо ў першы дзень суда сведкі абвінавачання і паліцэйскія, акружыўшыя мяне ў пакоі для сведак, пагражалі мне расправай, калі я не пакажу, што Мароніэмі быў спалены па загаду Антыкайнена. Аднак гэтыя пагрозы на мяне не дзейнічалі, і я заявіў суду, што ніякіх крыкаў нібыта спальваемага чалавека ў атрадзе Антыкайнена я не чуў, як і не чуў размоў аб тым, што кагосьці з палонных фінаў нібыта спалілі.

Пасля майго паказання пагрозы ў адносінах да мяне ўзмацніліся. Мне адкрыта гаварылі: «Ты адсюль жывым не выйдзеш. Мы цябе заражам, разарвем замучым. Ты павінен паказаць на судзе супроць Антыкайнена інакш расправа з табой будзе кароткая».

Знерваваўшыся ўшчэнт пад уплывам гэтых пагроз, не бачачы выхаду са становішча і апасаючыся за сваё жыццё, я даў на наступны дзень суду трэбуемыя ад мяне паказанні.

Адносіны да мяне з боку сведак, суда і паліцэйскіх пасля гэтага крута змяніліся к лепшаму. Мяне віншавалі, паціскалі руку і тут-жа далі каля 250 марак, абяцаўшы ў бліжэйшы час сабраць для мяне 30 тысяч фінскіх марак. Але пасля гэтага мяне аднаго ўжо нікуды не адпускалі. Са мной увесь час быў белакарэл, ахраннік, ён-жа сведка абвінавачання Кляпікаў, які зараз носіць прозвішча Куусініемі, і паліцэйскія.

Усведамляючы, што я зрабіў здрадніцтва і адчуваючы глыбокае раскаянне, я рашыў пакончыць самагубствам, спачатку давеўшы да ведама паўпрэдства аб усім, што здарылася. Але, як я ўжо вам сказаў, з мяне не спускалі вачэй і нікуды аднаго не адпускалі. Таму я напісаў на сваім пашпарце аб усім, што здарылася, рашыўшы знайсці які-небудзь спосаб паслаць яго у паўпрэдства, а потым ужо пакончыць з сабой.

29 мая мне ўдалося хітрасцю адлучыцца на некалькі мінут ад суправаджаўшага мяне Кляпікава і дабрацца да паўпрэдства.

Там я перадаў мой пашпарт і пацвердзіў усё тое, што я на ім напісаў.

Перад маім ад'ездам у Ленінград мяне ў паўпрэдстве дапытаў прадстаўнік фінляндскай пракуратуры ў прысутнасці нашага паўпрэда.

У часе гэтага допыту я зноў пацвердзіў усё тое, што я ўжо далажыў паўпрэдству і што я паведамляю зараз вам».

## Сялянскія дэманстрацыі ў Польшчы

**ВАРШАВА**, 2 чэрвеня. (БЕЛТА). Агенцтва «Прэс» перадае першыя весткі аб адбыўшыхся дэманстрацыях і мітынгах у Польшчы 30 і 31 мая з прычыны так званага сялянскага свята.

Згодна папярэдніх падлікаў, звыш мільёна сялян прымала ўдзел у дэманстрацыях. Найбольш буйныя дэманстрацыі адбываліся ў Галіцыі. У горадзе Яраславе дэманстравала 45 тысяч сялян, у Жэшове — 60 тысяч, у Ліманаве — 50 тысяч, у Бохніі — 40 тысяч, у Новым Сончы — 40 тысяч.

У Варшаўскім павеце ў сялянскіх мітынгах прыняла ўдзел каля 10 тысяч сялян. Агенцтва ўгледжвае ў гэтым **«доказ узрастаючай арганізацыйнай і палітычнай актыўнасці польскай вёскі».**

* * *

**ВАРШАВА**, 2 чэрвеня. (БЕЛТА). Як паведамляе «Варшаўскі дзённік народовы», міністэрства ўнутраных спраў разаслала павятовым начальнікам цыркуляр, у якім канстатуецца, што «комунізм пранікае ў такія легальныя арганізацыі, як «Стрэлец», «Легіён маладых», «333» (урадавая профсаюзная арганізацыя) і інш.». У сувязі з гэтым адміністратыўныя ўлады ў Пазнанскім ваяводстве, паводле слоў газеты, «пачалі стварэць грамадскія камітэты, задачамі якіх з'яўляецца барацьба супроць узрастаючага ўплыву комунізма».

## Ход падняцця папараў, праполкі яравых ільну і падняцця цаліны па раёнах БССР на 30 мая (у процантах)

| №№ п. п. | НАЗВА РАЁНАЎ | Паднята папараў | Праполата: Яравых | Праполата: Ільну | Узарана цаліны |
|---|---|---|---|---|---|
| 1. | Барысаўскі | 102,7 | 3,5 | 3,8 | 5,9 |
| 2. | Уздзенскі | 100,1 | 41,5 | 50,6 | 61,0 |
| 3. | Капыльскі | 100,0 | 10,1 | 17,4 | 48,0 |
| 4. | Бярэзінскі | 100,0 | 2,8 | 6,1 | 39,0 |
| 5. | Менскі | 98,2 | 0,9 | 3,3 | 4,0 |
| 6. | Бабруйскі | 96,8 | 74,7 | 55,8 | 36,6 |
| 7. | Клічаўскі | 93,4 | 39,4 | 44,6 | 12,8 |
| 8. | Дрыбінскі | 91,0 | 63,6 | 52,2 | 33,0 |
| 9. | Любаньскі | 88,0 | 18,5 | 79,6 | 40,1 |
| 10. | Старобінскі | 86,8 | 91,0 | 101,3 | 1,5 |
| 11. | Крычаўскі | 85,2 | 12,1 | 12,8 | 4,5 |
| 12. | Камарынскі | 84,4 | 81,8 | 35,1 | 49,8 |
| 13. | Прапойскі | 83,7 | 65,7 | 92,6 | 37,9 |
| 14. | Быхаўскі | 81,4 | 6,8 | 2,8 | 4,9 |
| 15. | Пухавіцкі | 81,3 | 12,4 | 51,4 | 25,0 |
| 16. | Рагачоўскі | 80,7 | 51,4 | 63,5 | 16,6 |
| 17. | Кіраўскі | 80,2 | 20,1 | 7,6 | 14,5 |
| 18. | Дзяржынскі | 78,5 | 21,4 | 43,0 | 8,0 |
| 19. | Магілеўскі | 77,9 | 31,4 | 22,3 | 13,5 |
| 20. | Слуцкі | 76,1 | 37,3 | 53,6 | 51,0 |
| 21. | Заслаўскі | 73,8 | 14,7 | 25,5 | 12,2 |
| 22. | Чашніцкі | 73,7 | 46,0 | 100,0 | 27,2 |
| 23. | Гомельскі | 71,4 | 11,7 | 13,2 | 30,0 |
| 24. | Старадарожскі | 69,5 | 13,5 | 26,5 | 18,3 |
| 25. | Шкловскі | 69,4 | 7,3 | 49,6 | 4,4 |
| 26. | Чэрвеньскі | 69,2 | 35,9 | 66,4 | 14,8 |
| 27. | Ушацкі | 68,4 | 51,6 | 98,4 | 26,1 |
| 28. | Капаткевіцкі | 67,1 | 58,8 | 86,1 | 17,5 |
| 29. | Лепельскі | 66,9 | 52,8 | 82,0 | 9,9 |
| 30. | Чэрыкаўскі | 65,7 | 47,8 | 32,6 | 1,3 |
| 31. | Смілавіцкі | 65,5 | 12,4 | 41,4 | 50,3 |
| 32. | Лагойскі | 65,4 | 20,5 | 8,8 | 9,5 |
| 33. | Крупскі | 65,3 | 0,9 | 8,9 | 14,3 |
| 34. | Бягомльскі | 64,7 | 29,3 | 52,9 | 12,5 |
| 35. | Суражскі | 64,4 | 48,4 | 78,3 | 12,8 |
| 36. | Аршанскі | 62,8 | 7,0 | 35,7 | 21,5 |
| 37. | Кармянскі | 60,9 | 10,4 | 17,6 | 5,8 |
| 38. | Горацкі | 59,7 | 22,1 | 32,4 | 33,5 |
| 39. | Лоеўскі | 59,5 | 65,3 | 105,3 | 78,3 |
| 40. | Плешчаніцкі | 58,5 | 27,1 | 9,5 | 7,7 |
| 41. | Мсціслаўскі | 56,5 | 17,5 | 49,5 | 4,4 |
| 42. | Талачынскі | 56,1 | 6,0 | 55,1 | 15,7 |
| 43. | Сенненскі | 55,5 | 14,7 | 99,1 | 1,6 |
| 44. | Чавускі | 53,9 | 13,6 | 34,9 | 3,5 |
| 45. | Багушэўскі | 53,1 | 62,2 | 44,8 | 21,1 |
| 46. | Чырвонаслабодскі | 52,4 | 25,6 | 37,6 | 48,5 |
| 47. | Мазырскі | 52,2 | 44,4 | 44,5 | 13,1 |
| 48. | Уваравіцкі | 51,3 | 8,0 | 20,8 | 5,4 |
| 49. | Будакашалеўскі | 51,0 | 18,9 | 22,4 | 18,5 |
| 50. | Хоцімскі | 50,4 | 0,6 | 28,1 | 3,8 |
| 51. | Клімавіцкі | 50,2 | 16,8 | 38,3 | 6,0 |
| 52. | Грэскі | 48,8 | 29,0 | 46,0 | 5,8 |
| 53. | Петрыкоўскі | 48,0 | 67,7 | 78,6 | 3,0 |
| 54. | Журавіцкі | 47,4 | 28,4 | 29,3 | 14,8 |
| 55. | Полацкі | 46,5 | 71,6 | 66,3 | 8,1 |
| 56. | Церахаўскі | 44,5 | 28,2 | 57,7 | 3,4 |
| 57. | Дрысенскі | 44,0 | 41,3 | 26,7 | 4,5 |
| 58. | Лельчыцкі | 43,4 | 22,2 | 49,2 | 40,0 |
| 59. | Смалявіцкі | 43,3 | 5,0 | 14,5 | — |
| 60. | Жлобінскі | 42,7 | 27,0 | 19,6 | 2,5 |
| 61. | Дубровенскі | 42,6 | 14,2 | 73,3 | 30,5 |
| 62. | Добрушскі | 41,1 | 26,7 | 10,4 | 4,2 |
| 63. | Сіроцінскі | 40,7 | 28,2 | 41,7 | 23,7 |
| 64. | Бялыніцкі | 39,5 | 2,6 | 18,6 | 14,1 |
| 65. | Ветрынскі | 38,9 | 57,3 | 100,0 | 10,2 |
| 66. | Чырвонапольскі | 37,9 | 23,5 | 22,4 | 10,7 |
| 67. | Асвейскі | 37,2 | 34,6 | 55,9 | 8,0 |
| 68. | Халопеніцкі | 36,3 | — | 12,4 | 8,3 |
| 69. | Брагінскі | 35,4 | 38,5 | 13,6 | 9,1 |
| 70. | Круглянскі | 35,2 | 9,0 | 12,0 | 26,4 |
| 71. | Бешанковіцкі | 32,6 | 14,8 | 37,9 | 12,6 |
| 72. | Парыцкі | 30,9 | 8,4 | 7,0 | 9,4 |
| 73. | Касцюковіцкі | 29,1 | 13,3 | 14,1 | 8,0 |
| 74. | Віцебскі | 28,9 | 32,0 | 48,3 | 25,0 |
| 75. | Чаўсрскі | 28,5 | 12,3 | 28,5 | — |
| 76. | Асіпавіцкі | 26,7 | 33,4 | 6,3 | 10,2 |
| 77. | Свяцілавіцкі | 25,9 | — | 77,1 | 13,3 |
| 78. | Гарадоцкі | 25,5 | 14,4 | 28,0 | 18,2 |
| 79. | Хойніцкі | 25,2 | 27,3 | 34,7 | — |
| 80. | Рэчыцкі | 24,5 | 13,2 | 11,2 | 6,0 |
| 81. | Веткаўскі | 23,7 | 12,4 | 20,8 | 7,3 |
| 82. | Лёзнянскі | 23,6 | 31,9 | 79,8 | 12,6 |
| 83. | Расонскі | 23,3 | 13,7 | 18,4 | 19,9 |
| 84. | Глускі | 18,7 | 23,6 | 23,7 | 2,2 |
| 85. | Нараўлянскі | 18,0 | 83,1 | 58,3 | 33,2 |
| 86. | Тураўскі | 15,4 | 23,5 | 51,1 | 17,4 |
| 87. | Мехаўскі | 13,8 | 0,2 | 4,0 | 4,3 |
| 88. | Ельскі | 11,9 | 63,7 | 55,2 | 6,1 |
| 89. | Даманавіцкі | 10,9 | 39,5 | 40,2 | 9,2 |
| 90. | Жыткавіцкі | 0,7 | 76,3 | 47,7 | 11,5 |
| | Па БССР: | 53,6 | 25,3 | 43,8 | 15,0 |
| | Было на 25 мая 1936 г. | 32,6 | 6,5 | 16,7 | 9,2 |
| | Было на 30 мая 1935 г. | 16,1 | — | 4,2 | — |

УЧОТНА-СТАТЫСТЫЧНЫ АДДЗЕЛ НАРКАМЗЕМА БССР.

## ПЕРАД СТВАРЭННЕМ НОВАГА ФРАНЦУЗСКАГА УРАДА

### З'ЕЗД СОЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ ПАРТЫІ

ПАРЫЖ, 2 чэрвеня. (БЕЛТА). 33 з'езд соцыялістычнай партыі Францыі закончыў сваю работу сёння на світанні. Адагалосна прынятая агульнанацыялістычная рэзалюцыя адабрае рашэнне нацыянальнага совета партыі ад 10 мая аб тым, **каб соцыялістычная партыя ўзначаліла новы ўрад.** У рэзалюцыі зноў выказваецца жаль, што комуністы адмовіліся ўвайсці ва ўрад Блюма. Разам з тым у рэзалюцыі гаворыцца: **«Соцыялістычная партыя рада, што можа разлічваць на нязменнае падтрыманне, абяцанае ёй компартыяй».**

Выказаўшы Леону Блюму поўнае давер'е, з'езд падкрэслівае далей што ўрад Блюма будзе ажыццяўляць не соцыялістычную праграму, а **праграму народнага фронта,** прынятую соцыялістамі разам з іншымі партыямі.

Рэзалюцыя ў агульных рысах намячае асноўныя задачы новага ўрада: **разбіць фашызм, абараніць дэмакратычныя свабоды, змагацца супроць банкаўскай і прамысловай алігархіі, знішчыць беспрацоўе, дабіцца ажыўлення ў гаспадарцы, дэмакратызаваць армію, скарацiць тэрмін ваеннай службы, высунуць Францыю на першае месца сярод краін, якія рашуча імкнуцца да міру.**

У рэзалюцыі гаворыцца, што з'езд лічыць у вышэйшай ступені пажаданым захаваць адзінства дзеянняў у якасці адзінага сродку, здольнага зламаць наступленне фашызма. З'езд лічыць гэта адзінства дзеянняў неабходным і кароткім уступам да неабходнага **арганічнага адзінства.** Каб падрыхтаваць гэта адзінства, з'езд высоўвае ідэю стварэння **пастаяннага ўзгадняльнага камітэта,** з той агаворкай, што гэты камітэт не павінен з'яўляцца чымсьці накшталт звышпартыйнага органа.

## ПІСЬМО ЦК КОМПАРТЫІ ФРАНЦЫІ

**ПАРЫЖ,** 2 чэрвеня. (БЕЛТА). Учора з'ездам соцыялістычнай партыі было атрымана другое пісьмо сакратарыята ЦК компартыі Францыі, падпісанае Торэзам, якое гаворыць:

«Мы звярнуліся да вас з пісьмом, якое, згодна нашых вестак, не было зачытана з трыбуны вашага з'езда. Мы прапануем вам у гэтым пісьме зрабіць яшчэ адно сумеснае намаганне для ажыццяўлення міжнароднага адзінага фронта.

Мы лічым карысным паведаміць, што раніцой 1 чэрвеня адбылася гутарка паміж Кашэнам і Торэзам, з аднаго боку, і Дэ-Брукерам і Адлерам — з другога. Мы даведаліся, на жаль, што пазіцыя соцыялістычнага інтэрнацыянала асталася нязменнай. Мы думаем, што гэта пастаяннае адмаўленне ад міжнароднага адзінства дзеянняў прыносе самую цяжкую шкоду справе рабочага класа і можа толькі радаваць ворагаў свабоды і міру.

Будучы ўпэўненымі, што выказваем агульны настрой комуністычных і соцыялістычных рабочых нашай краіны і ідзем насустрач жаданням працоўных усіх краін, мы настойліва просім вас энергічна выступіць перад соцыялістычным інтэрнацыяналам з тым, каб **паспяховы прыклад адзінага фронта ва Францыі і ў Іспаніі атрымаў прыменне ў міжнародным маштабе».**

## ПАШЫРАЕЦЦА ЗАБАСТОЎКА ФРАНЦУЗСКІХ МЕТАЛІСТАЎ

ПАРЫЖ, 3 чэрвеня. (БЕЛТА). У сучасны момант у парыжскім раёне і часткова ў правінцыі бастуюць да 200 прадпрыемстваў з агульным лікам рабочых у некалькі дзесяткаў тысяч чалавек. Бастуюць ужо не толькі металісты і рабочыя машынабудаўнічай прамысловасці, але і рабочыя хімічных, харчовых, папяровых і іншых прадпрыемстваў. Забастоўка праходзіць усюды прыблізна ў аднолькавых формах. У паўны момант рабочыя спыняюць работу, самі застаюцца на прадпрыемстве, выстаўляюць каля прадпрыемства пікеты і пасля гэтага пачынаюць перагаворы з прадпрыемцамі.

У сувязі з забастоўкай адбылося сумеснае пасяджэнне бюро ўсеагульнай канфедэрацыі працы і аб'яднання профсаюзаў парыжскага раёна. У апублікаваным пасля пасяджэння камюніке выказваецца поўная брацкая салідарнасць з бастуючымі і вітаюцца іх бліскучая дысцыпліна і выдатная хладнакроўнасць».

## ЗАЯВА АБІСІНСКАГА НЕГУСА

**ЛОНДАН,** 2 чэрвеня. (БЕЛТА). Абісінскі негус, прыбыўшы ў Саутгемптон (Англія), заявіў карэспандэнту газеты «Дэйлі тэлеграф», наступнае:

«Нельга дапусціць, каб абісінская цывілізацыя, якая налічвае 25 стагоддзяў, была знішчана ў 25 тыняў з дапамогай варварскіх метадаў».

Карэспандэнт запытаў негуса, ці пастаўлены яму якія-небудзь умовы, якія абмяжоўваюць яго будучую дзейнасць? Негус адказаў: «Нават самы горшы злачынец мае магчымасць сябе абараняць. Разумеецца, афяра агрэсіі, асуджанай 52 краінамі, можа па меншай меры растлумачыць акалічнасці гэтай агрэсіі. Жэнева знойдзе вырашэнне пытання. Абісінская палітыка зусім не змянілася. У якасці члена Лігі нацый Абісінія спадзяецца на Лігу.

Многія малыя краіны, якія ўваходзяць у Лігу нацый, у той-жа меры, што і мы, зацікаўлены ў тым, каб сіла не перамагала права».

## ЯПОНСКАЯ АГРЭСІЯ У ПАЎНОЧНЫМ КІТАІ

**ТОКІО,** 2 чэрвеня. (БЕЛТА). Агенцтва «Домей цусін» паведамляе, што кітайскі пасол у Японіі Сю Шы-ін 1 чэрвеня зрабіў паўторнае строгае прадстаўленне японскаму ўраду супроць павелічэння колькасці японскіх войск у Паўночным Кітаі. Японскі міністр замежных спраў Арыта адхіліў кітайскі пратэст, спасылаючыся на «комуністычную небяспеку ў Паўночным Кітаі».

* * *

**ШАНХАЙ,** 2 чэрвеня. (БЕЛТА). Як паведамляе друк, шанхайскі аб'яднаны саюз выратавання нацыі прыняў рашэнне аб'явіць трохдзённую забастоўку фабрык, універсітэтаў, школ і гандлёвых прадпрыемстваў горада ў знак пратэсту супроць павелічэння ліку японскіх войск у Паўночным Кітаі. Камітэт саюза звярнуўся да нанкінскага ўрада, правінцыяльных урадаў і да ўсіх грамадскіх арганізацый з адозвай, у якой заклікае народ узняцца, як адзін чалавек, для адпору японскай агрэсіі і выратавання нацыі.

Усеагульная забастоўка намечана на 6 чэрвеня. Кітайскія ўлады прымаюць рашучыя меры к таму, каб не дапусціць забастоўкі.

* * *

**ТОКІО,** 2 чэрвеня. (БЕЛТА) Згодна паведамлення друку, прыбыўшы 1 чэрвеня быўшы каманд уючы японскімі войскамі ў Паўночным Кітаі Тада ў гутарцы з прадстаўнікамі друку заявіў:

«Прыязнымі жэстамі немагчыма прымусіць Кітай аднавіць добрыя адносіны з Японіяй. Таму, **замест прыязных жэстаў у адносінах да Кітая, Японія павінна рушыць наперад,** ажыццяўляючы японскія планы стабілізацыі Далёкага Усходу. Японія вымушана была павялічыць свае войскі ў Паўночным Кітаі для абароны японскіх падданых і ў інтарэсах паўночна-кітайскага насельніцтва».

* * *

ЛОНДАН, 3 чэрвеня. (БЕЛТА). Газета «Дэйлі геральд» піша, што падзеі ў Кітаі імкліва прыбліжаюцца да найбольш небяспечнага з 1931 года (захват Манчжурыі японцамі) моманта на Далёкім Усходзе. Японія збіраецца патрабаваць ад Англіі і Францыі вывесці з Бейпіна ахоўныя войскі пасольстваў. Японія таксама збіраецца аб'явіць «незалежнасць» правінцый Хебей і Чахар, злучыўшы іх з Манчжоў-Го. Нанкін, — піша далей газета хістаецца паміж павінаваннем і супраціўленнем. Аднак, настроі ў карысць супраціўлення Японіі растуць і ўмацоўваюцца. Кантон патрабуе супраціўлення ў той час, як на поўначы і захадзе Кітая кітайская Чырвоная армія заклікае ўсіх патрыётаў, незалежна ад іх прыналежнасці да той ці іншай партыі, аб'яднацца для супраціўлення Японіі.



800 бульбасартыровак выпусціць у гэтым годзе Гомсельмаш. Ліцейны цэх завода перайшоў на канвеерную заліўку. НА ЗДЫМКУ — абрубка махавікоў да сартыровак. Рабочы-абрубшчык т. Іван Кухараў выконвае норму на 170 проц. Фото Грына (Белсаюзфото).

# АБМЕРКАВАННЕ ПРАЕКТА ПАСТАНОВЫ ЦВК І СНК САЮЗА ССР

## МАЦІ АДЗІНАЦЦАЦІ ДЗЯЦЕЙ

ВІЦЕБСК, 2 чэрвеня. (Кар. «Звязды»). Учора жонка шофера комгаса, Іда Беркаўна Шофман у больніцы імя Калініна нарадзіла адзінаццатае дзіцё. Радасці шчаслівай мацеры няма меж. Усе яе дзеці жывыя і здаровыя. Старшы 20-гадовы сын Арон вучыцца і працуе ў Томску, 18-гадовы Лёва працуе токарам на заводзе імя Кірава ў Віцебску, 17-гадовы Меер канчае дзесяцігодку, 16-гадовая дачка Галя пераходзіць у сёмы клас, 13-гадовая Дора вучыцца ў пятым класе, Барыс—11 год — вучыцца ў IV класе, 10-гадовая Роза — у трэцім, 8-гадовы Ісак — у другім класе. 6-гадовая Муся і 4-гадовая Жэня наведваюць дзіцячы сад.

— Я, — гаворыць Шофман, — лічу сябе самай шчаслівай мацерай, ніколі ў жыцці абортаў не рабіла.

## ЗАЎВАГІ І ПРАПАНОВЫ ДА ЗАКОНАПРАЕКТА

На ўсіх прадпрыемствах і ў калгасах Магілеўшчыны шырока абмяркоўваецца законапраект аб забароне абортаў, павелічэнні матэрыяльнай дапамогі рожаніцам і т. п. Працоўныя Магілеўшчыны ўносяць рад заўваг і прапаноў да законапраекта.

Работніца скурзавода тав. Кастусёва лічыць няверным поўную забарону абортаў. На яе думку, многасямейным (5—6 дзяцей) работніцам аборты могуць быць дазволены. Паасобныя работніцы выказваюць думку, што плата за разводы павінна быць зменшана, бо не заўсёды развод з'яўляецца рэзультатам лёгкадумнага падыходу да сям'і і шлюбу. Работніца трубаліцейнага завода тав. Пунчанка прапанавала спаганяць аліменты і прыцягваць да адказнасці не толькі мужчын, але і жанчын, якія кідаюць сваіх дзяцей.

ПАДЛІПСКІ.

## ЗАМЕСТ АБАРТАРЫЯ — РАДЗІЛЬНЫ ДОМ

ГОМЕЛЬ, 2 чэрвеня. (Кар. «Звязды»). З вялікай актыўнасцю працоўныя Гомеля абмяркоўваюць законапраект аб забароне абортаў і т. п.

Калектыў гомельскага радзільнага дома разам з рожаніцамі ўнёс рад дадаткаў да праекту закона: аліменты браць у аднолькавым размеры не толькі ад бацькі, але і ад маткі, калі яна пакіне дзяцей на мужа, павысіць спагнанне грошай за развод, але пры гэтым улічваць прычыны разводу. У Залінейным раёне існуе абартарый «Чырвонага крыжа». Калектыў радзільнага дома прапануе ператварыць абартарый у радзільнае аддзяленне для Залінейнага раёна.

Жонкі інжынерна-тэхнічных работнікаў і стаханаўцаў завода імя Кірава ўнеслі такія прапаўкі: аказваць дапамогу маці не толькі пасля сёмага дзіцяці, але і пасля пятага, увесці ва ўсіх радзільных дамах масавае абязбольванне родаў, забяспечыць радзільныя дамы аўтамашынамі для прывозкі і адвозкі рожаніц. У тых выпадках, калі пакінутая мужам жонка не можа знайсці яго для спагнання аліментаў, дзяржава павінна ўстанавіць ёй адначасовую дапамогу.

## КАТЭГАРЫЧНАЯ ЗАБАРОНА АБОРТАЎ НЕПАТРЭБНА

Законапраект аб забароне абортаў, павелічэнні матэрыяльнай дапамогі рожаніцам і т. п. безумоўна своечасовы і правільны.

Са свайго боку хачу ўнесці некалькі дадаткаў. Законапраект дапускае аборты толькі ў тых выпадках, калі працяг цяжарнасці прадстаўляе небяспеку для жыцця, або здароўя цяжарнай жанчыны. Мне думаецца, што такая катэгарычная забарона абортаў непатрэбна. Трэба дазволіць аборт у тых выпадках, калі жанчына ўжо мае пяць ці больш дзяцей. Першы аборт безумоўна трэба катэгарычна забараніць. Па мойму, трэба студэнткам, якія яшчэ вучацца на першым і другіх курсах, таксама дазволіць аборт.

Праект закона прадугледжвае спагнанне на ўтрыманне аднаго дзіцяці адной трэці з зарплаты адказчыка. Але бываюць выпадкі, калі жанчына, пакідаючы мужа, пакідае з ім і дзяцей. У такіх выпадках трэба спаганяць аліменты таксама і з жанчыны.

Студэнт А. ХАТЫЛЁЎ.

## ЛЮБОЎНА ВЫХОЎВАЦЬ ДЗЯЦЕЙ

ЖЛОБІН, 3 чэрвеня. (БЕЛТА). З сакавіка ў жлобінскай раённай больніцы імя Гікало практыкуецца абязбольванне родаў. За два месяцы 62 жанчыны, з іх 14 калгасніц, нарадзілі дзяцей без болю. Рожаніцы выказваюць сваю шчырую падзяку за клопаты аб іх з боку партыі і ўрада.

У кнігу пажаданняў многія рожаніцы запісваюць свае ўражанні. «Не верылася мне, што знойдзены такія сродкі, якія могуць заглушыць несцярпімую боль пры родах, — заяўляе рожаніца Леанёнка. — Мне здавалася гэта казкай. Я раджала ўпершыню і не адчула ніякай болі. Жанчыны павінны з любоўю раджаць і выхоўваць дзяцей».

# ПАДРЫХТОЎКА ПРАПАГАНДЫСЦКІХ КАДРАЎ

Надзвычай вырасла за апошні час патрэбнасць у кваліфікаваных і ведаючых сваю справу майстрах большэвіцкай прапаганды. Шырокі размах партыйнай вучобы патрабуе і шырокага размаху падрыхтоўкі і перападрыхтоўкі кадраў прапагандыстаў і агітатараў.

Нам патрэбны тысячы людзей, здольных клапатліва і любоўна, з глыбокім веданнем сваёй справы выхоўваць членаў партыі, далучаць іх да скарбніцы марксізма-ленінізма, вучыць іх любіць і шанаваць нашу большэвіцкую партыю, ведаць яе гісторыю.

Выконваючы пастанову ЦК ВКП(б) «Аб прапагандысцкай рабоце ў бліжэйшы час», ЦК КП(б)Б намячае прапусціць праз курсы прапагандыстаў тысячы найбольш праверваных і падрыхтаваных комуністаў.

На працягу 1936 года праз трохмесячныя курсы будуць прапушчаны 526 прапагандыстаў па гісторыі партыі і 300 прапагандыстаў школ палітграматы. Апрача гэтага праз курсы павінны быць перападрыхтаваны 100 загадчыкаў партгабінетаў, 50 раённых прапагандыстаў, 40 загадчыкаў аддзелаў культуры і прапаганды ленінізма гаркомаў і райкомаў, 200 кіраўнікоў агітколектываў і нізавых агітатараў. Усяго 1.185 чал. ЦК зацвердзіў таксама план арганізацыі вячэрніх школ прапагандыстаў на 516 чалавек без адрыву ад вытворчасці. Гэтыя школы ўжо арганізаваны і працуюць у Менску, Барысаве, Слуцку і Гомелі.

У красавіку месяцы пачалі сваю работу 11 курсавых баз, у якіх навучаецца 350 чалавек. Курсы створаны ў акруговых цэнтрах і буйных прамысловых гарадах БССР і забяспечаны лепшымі выкладчыкамі і вучэбнымі дапаможнікамі. Вучэбны план курсаў складзен так, што асноўная ўвага аддаецца цытанням вывучэння гісторыі партыі і ленінізма. Апрача гэтых прадметаў курсанты вывучаюць геаграфію, пытанні партыйнага будаўніцтва і методыку арганізацыі партыйнай прапаганды. Асабліва вызелена пытанне аб вывучэнні падручніка, па якому прапагандыст павінен будзе працаваць у гуртках і школах.

Курсы працуюць ужо паўтара месяца. Можна падвесці і некаторыя папярэднія вынікі. Хоць у большасці сваёй курсы па свайму складу падабраны нядрэнна, але ёсць выпадкі, калі райкомы пасылалі на курсы зусім непадрыхтаваных і непісьменных людзей. У Лепелі і Оршы прышлося перагледзець склад курсаў і адкамандзіраваць назад значную групу слухачоў. Так, у Оршы на курсы былі прысланы зусім палітычна непісьменныя людзі (Белякоў, Падалеўскі, Красноўскі).

Рэкорд няўважлівых адносін да камплектавання курсаў паказаў Талачынскі райком. Прысланы ім тав. Літвінка ні на адно з пастаўленых яму пытанняў не змог адказаць. Будакашалеўскі, Чачэрскі і Уваравіцкі райкомы таксама недаацанілі значэння гэтых курсаў і вылучылі на курсы яўна непадрыхтаваных таварышоў. Такія райкомы, як Крупскі, Кармянскі, Дзяржынскі, зусім не вылучылі ні аднаго чалавека.

Апрача вучэбнай праграмы для курсантаў арганізоўваецца рад лекцый па прыродазнаўству (Полацк), па міжнароднаму становішчу (Гомель, Менск, Віцебск), па літаратуры і т. д. Курсанты наведваюць кожную новую кінокарціну, бываюць па два-тры разы ў месяц у тэатры, чытаюць мастацкую літаратуру. Многія курсанты паказваюць сапраўдныя ўзоры барацьбы за аўладанне тэорыяй Маркса—Энгельса—Леніна—Сталіна.

Так, у Полацку многія курсанты-прапагандысты ў рэзультаце іх палітычнага росту ўжо намячаюцца да вылучэння на кіруючую комсамольскую і партыйную работу (Грыбаў і Саўчанка).

Курсант Патапенка ў Магілеве (рабочы завода імя Сталіна) вучыцца на «выдатна». Ён шмат працуе над сабою і замест кіраўніка школы палітграматы пасля курсаў будзе кіраваць гуртком па гісторыі партыі. Добра вучацца і паказваюць вялікі рост курсанты: Ратнер, Сцепанюк і многа іншых. На гомельскіх курсах курсанты Радчук, Лашкевіч, Муцкала і інш. займаюцца па гісторыі партыі на «выдатна» і «добра».

Першае скліканне курсаў, не гледзячы на рад недахопаў у іх арганізацыі і рабоце з'яўляецца ўсё-ж выдатным пачынам па ажыццяўленню рашэння ЦК ВКП(б) аб падрыхтоўцы прапагандыстаў. Поспехі іх работы будуць залежаць ад таго, наколькі партыйныя арганізацыі будуць штодзенна клапаціцца аб курсах, аказваць ім усямернае падтрыманне і ўвагу.

Праз месяц 350 прапагандыстаў скончаць сваю трохмесячную вучобу. З новымі сіламі, атрымаўшы досыць вялікую тэарэтычную падрыхтоўку, папоўнядь яны нашы гурткі і школы і будуць спрыяць далейшаму паляпшэнню справы ідэйна-палітычнага выхавання комуністаў.

Н. СІГНАЛАЎ.

# ЗАВАЯВАЦЬ ГОНАР ПАДПІСАЦЬ ПІСЬМО ВЯЛІКАМУ СТАЛІНУ

ЧЭРВЕНЬ. (Па тэлефону). З вялікім уздымам сустрэлі калгаснікі сельскагаспадарчай арцелі «Самалёт», прапанову калгаснікаў Бабруйшчыны аб пасланні пісьма таварышу Сталіну.

— Перад другімі калгасамі нам чырванець не прыдзецца. Пасеялі мы добра. Азімыя прапалолі, зараз загатаўляем торф, — гаворыць калгасніца-ударніца Яказіна Лізавета.

— Адным з першых у раёне, — заяўляе старшыня калгаса Кастусь Андрончык, — мы скончылі сяўбу.

— Нам цяпер трэба падвоіць тэмпы работы. Вось мы толькі-што слухалі пастанову ЦК КП(б)Б аб адставанні Чэрвеньскага раёна па прапоцы. Гэта нас абавязвае многаму. Нам трэба цяпер прадумаць, што мы зробім на працягу бліжэйшага часу, каб выканаць пастанову ЦК КП(б)Б і заяваваць гонар падпісаць пісьмо роднаму Сталіну.

У час веснавой сяўбы ў нас выраслі выдатныя людзі, якія на 200—250 проц. перавыконвалі норму, як Гаўрыла Андрончык і Іван Вергейчык на ворыве, Ульяна Трыпуз, Ліда Лісіца на капанні торфу, Максім Кудзін, Фядос Зянсвіч па ручной сяўбе.

Цяпер у калгасе будуюцца гумно для маладзьбы, вялікая канюшня. Закончана ўстаноўка 18-сілавага нафтавага рухавіка.

І. ШЛЯФЕР.

## КАНКРЭТНЫМІ СПРАВАМІ АДКАЗВАЮЦЬ НА ПРАПАНОВУ БАБРУЙСКІХ КАЛГАСНІКАЎ

ЧАВУСЫ. Прапанова калгаснікаў Бабруйшчыны знайшла гарачы водгук сярод калгаснікаў раёна. Па калгасах разгарнулася спаборніцтва за права падпісаць пісьмо таварышу Сталіну.

Калгаснікі калгаса імя Будзённага, Дужаўскага сельсавета, у адказ на прапанову калгаснікаў Бабруйшчыны па-баявому праводзяць праполку ільну і яравых і падрыхтоўку да ўборачнай.

— Ні аднаго каліва зелля не пакінем на полі, — заяўляюць тысячніцы Мар'я Вараб'ева, Халося Кандылёва і Пасця Логвінава. Падрыхтуем дастойную сустрэчу ўборачнай, каб заваяваць права падпісаць пісьмо нашаму любімаму і роднаму Сталіну.

Ч. БЕРАЗОЎСКАЯ.

# У СОЎНАРКОМЕ БССР

Соўнарком задаволіў хадайніцтва праўлення Саюза совецкіх пісьменнікаў БССР і асігнаваў 26 тыс. руб. на скончэнне 6-кватэрнага драўлянага дома для пісьменнікаў. На пабудову дачы народнаму паэту рэспублікі Янку Купале адпушчана 25 тыс. руб. Дзяржплану БССР даручана вызеліць неабходныя будматарыялы для будаўніцтва дачы.

***

Народны камісарыят мясцовай прамысловасці БССР прадставіў генеральны каштарыс на будаўніцтва ў Барысаве фабрыкі клавішных музычных інструментаў. Соўнарком зацвердзіў каштарыс у суме 3.739 тыс. руб. і ўстанавіў тэрмін пуску гэтай фабрыкі ў 1937 г.

***

Соўнарком абавязаў НКАховы здароўя пабудаваць у Магілеве вучэбны корпус медтэхнікума на 500 месц і здаць яго ў эксплуатацыю ў IV квартале г. г. На будаўніцтва корпуса асігнавана 700 тыс. руб.

***

Менскі будаўнічы тэхнікум арганізуе экскурсію студэнтаў на галоўныя будоўлі СССР. Соўнарком дазволіў Наркамлясдпрому выдаткаваць на экскурсію 20 тыс. руб.

# АБ РАБОЦЕ СЕЛЬСКІХ РЭВІЗІЙНЫХ КАМІСІЯЎ

## ПАСТАНОВА ПРЭЗІДЫУМА ЦВК БССР

Разам з велізарным ростам укладанняў у соцыялістычную прамысловасць значна выраслі бюджэты новай калгаснай вёскі. Выдаткі па сельскіх бюджэтах ідуць галоўным чынам на ўтрыманне школ, больніц, хат-чытальнь і іншыя соцыяльна-культурныя мерапрыемствы вёскі. Аб'ём выдаткаў сельскіх бюджэтаў у 1936 годзе выражаецца ў 117,5 млн. руб.

Буйныя затраты па сельскаму бюджэту на соцыяльна-культурнае абслугоўванне калгаснай вёскі патрабуюць рашучага паляпшэння якасці фінансавай работы сельсавета.

Барацьба за фінансавую дысцыпліну, за захаванне дзяржаўных сродкаў і соцыялістычнай уласнасці з'яўляецца барацьбой за ўмацаванне органаў дыктатуры пролетарыята, за ўзнятае аўтарытэту сельскага совета ў вачах працоўнага насельніцтва.

Пачэсны абавязак грамадскага кантралёра ў барацьбе за захаванне соцыялістычнай уласнасці на вёсцы ляжыць на рэвізійных камісіях сельсаветаў.

Адказныя задачы, ускладзеныя на рэвізійныя камісіі, выразна ўказаны ў пастановах і дырэктывах урада СССР і БССР. Аднак, далёка не ва ўсіх раёнах і сельсоветах нашай рэспублікі работа сельскіх рэвізійных камісій вядзецца сістэматычна. Растраты дзяржаўных грошай у сельсоветах яшчэ нярадкая з'ява.

Прэзідыум ЦВК БССР, ставячы перад АВК, РВК, сельсоветамі і рэвіз. камісіямі задачу рашучага паляпшэння рэвізійнай работы ў сельсоветах і кіраўніцтва гэтай работай а боку РВК, прапануе правесці наступныя мерапрыемствы:

1. Умацаваць склад сельскіх рэвізійных камісій на працягу мая — чэрвеня месяцаў лепшымі праверанымі актывістамі вёскі, адкліканўшы праз сходы выбаршчыкаў пасіўных членаў рэвізійных камісій і стварыць вакол рэвіз. камісій шырокі грамадскі актыў.

2. Дабіцца рэгулярнага правядзення сельскімі рэвізійнымі камісіямі штомесячных рэвізій касы і штоквартальна — дакументальных рэвізій усёй фінансавай дзейнасці сельсоветаў.

3. Заслухоўваць на прэзідыумах і пленумах сельсоветаў справаздачы рэвізійных камісій аб выніках рэвізіі з безадкладным прыняццем мер да ліквідацыі выяўленых недахопаў і папярэджання іх у далейшым.

4. Забяспечыць поўнае і правільнае ажыццяўленне сельскімі советамі прадастаўленых ім законам бюджэтных праў.

5. Дабіцца правільнага і своечасовага вядзення фінансавага ўчоту і справаздачнасці, а таксама ўчоту інвентару і маемасці ва ўсіх сельсоветах і падпарадкаваных ім установах.

6. Аб кожным выпадку растраты ў сельсоветах паведамляць НКФ БССР і на месцы прымаць захады да пакрыцця нанесенай страты дзяржаве і пакарання вінаватых.

Пры ацэнцы работы РВК і сельсоветаў ЦВК БССР будзе асабліва ўлічваць становішча рэвізійнай работы і выкананне ўрадавых дырэктыў па барацьбе за жорсткую фінансава-бюджэтную дысцыпліну.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта БССР
А. ЧАРВЯКОЎ.

Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта БССР
М. ЛЯЎКОЎ.

14 мая 1936 г.
г. Менск.

НАПЯРЭДАДНІ АКРУГОВАГА З'ЕЗДА СОВЕТАЎ

# ВЫБАРЫ ДЭЛЕГАТАЎ

МАЗЫР, 2 чэрвеня. (Кар. «Звязды»). Раёны Мазырскай акругі ўзмоцнена рыхтуюцца да першага акруговага з'езда советаў. У сельскіх местачковых і гарадскіх советах праводзіцца масавая праверка работы секцый і дэпутацкіх груп, якія ў сваёй большасці дагэтуль не працавалі. У арганізацыйна-масавую работу советаў уцягваецца вырасшы за апошні час новы актыў.

У Танежскім сельсавеце, Тураўскага раёна, культурна-бытавая секцыя раней зусім не працавала, а зараз па яе ініцыятыве абвешчан паход за культуру ў быту. Члены секцыі правяраюць чыстату калгасных двароў і вуліц, становішча студняў. Ля апошніх па ініцыятыве секцыі робяцца вадапойныя карыты, вешаюцца цабры агульнага карыстання. Дарожная секцыя гэтага сельсавета, узначальваемая членам сельсавета Коўбам Кірылай, арганізавала пастаянную брыгаду калгаснікаў па дарожнаму будаўніцтву.

Зараз па ўсёй акрузе адбываюцца пленумы сельскіх, местачковых і гарадскіх советаў, на якіх выбіраюцца дэлегаты на акруговы з'езд. У большасці сельскіх советаў пленумы ўжо адбыліся. Выбрана каля 300 дэлегатаў, сярод якіх знатныя людзі Палесся, калгасныя ордэнаносцы Каўдэрка Марыя, Блоцкі Міхась, Бянецкі Станіслаў, а таксама лепшыя стаханаўцы сельскай гаспадаркі — трактарыст Баброў Нікіта, даярка Шчэрбіна Насця і рад іншых.

На гэтых-жа пленумах сельскія советы абмяркоўвалі вынікі веснавой сяўбы і вызначалі далейшыя мерапрыемствы па барацьбе за высокі сталінскі ўраджай.

ФРАЛОЎ.

# БЕЗАДКАЗНАСЦЬ ПРАЦЯГВАЕЦЦА

Яшчэ ў лютым рабочы завода «Чырвоная зорка» тав. Лапета пісаў у «Звязду», што ў санаторыі «Сасноўка» груба адносяцца да хворых, працэдурнае лячэнне не захоўваецца, лазня няспраўна, абеды нізкай каларыйнасці.

Гэтае пісьмо было пераслана ў ЦСПСБ. Займаўся праверкай фактаў інструктар т. Паўзевіч. Факты, як быццам, пацвердзіліся. Але скарга працоўнага ляжыць у кітэлі чыноўніка Паўзевіча без руху, бо ён ніяк не можа далажыць свайму начальству, а начальства ніяк не можа сабрацца паслухаць яго. А пара, бо прайшло ўжо больш чатырох месяцаў.

У магілеўскім райпрафсавеце бюракратычна адносяцца да рабочых і служачых, якія прыходзяць туды са скаргамі. Грубасці, лаянка, вокрыкі — пра такі стыль работы райпрафсавета паведамляла ў ЦСПСБ тав. Карсунская.

Гэта пісьмо атрымаў асабіста адказны сакратар тав. Гераўкер. Замест хуткага і чулага рэагавання на ўказаныя факты, аўтар больш месяца не можа даведацца аб лёсе сваёй заявы.

Тав. Галадзед, працуючы на пабудове пажарнага дэпо ў мястэчку Азарычын, Даманавіцкага раёна, захварэў. Яму ў раёне адмовілі аплаціць па бюлетэню. З прычыны таго, што ў Даманавіцкім раёне да гэтага часу няма ўпаўнаважанага ЦСПСБ, скарга была паслана ў Цэнтральны совет профсаюзаў. Тры месяцы прайшло з моманту падачы скаргі, але яна і да гэтага часу не вырашана.

Прыведзеныя намі факты не адзіныя. Але яны яркa сведчаць аб тым, што і пасля праверкі Камісіі Совецкага Кантроля становішча з рэагаваннем на скаргі працоўных і пісьмы рабселькораў не палепшылася. У ЦСПСБ яшчэ да гэтага часу не знішчана безадказнасць, не навучыліся бачыць за кожнай скаргай жывога чалавека.

Следуюць прыкладу Цэнтральнага совета і асобныя кіраўнікі ЦП і ЦК прафесіянальных саюзаў.

Першага лютага рахункавод Вятчынскага лесаўчастка скардзіўся ў Беларускі рэспубліканскі камітэт саюза лесу і сплаву на няправільнае знятце яго з работы. Адказу, вядома, ён не атрымаў.

Група рабочых торфзавода «Большавік» яшчэ ў студзені г. г. скардзілася на няправільнае, з-за асабістых рахункаў, знятце іх з работы. ЦК тарфянікаў, каб не перагружаць сябе, адаслаў гэту скаргу парткому завода. Больш аб лёсе рабочых, падаўшых скаргу, там не цікавіліся.

Гэтыя агідныя факты маглі мець месца толькі ў выніку бяздушных, фармальна-бюракратычных адносін да пісем і скарг працоўных. У апошняй пастанове аб разглядзе скарг працоўных Камісія Совецкага Кантроля моцна папярэдзіла ЦСПСБ. Як відаць, да гэтага часу ў ЦСПСБ не зрабілі з гэтага належных урокаў. Трэба памятаць, што профработнікі асабліва чула павінны адносіцца да скарг працоўных і ў кожным асобным выпадку дэталёва самім знаёміцца і глыбока высвятляць сутнасць справы.

Трэба пакончыць з антыпартыйнай практыкай нячулага падыходу да разбору скарг і навесці ўзорны парадак як у самім цэнтральным совеце, так і ў ЦП і ЦК саюзаў. Трэба прыцягнуць да суровай адказнасці тых бюракратаў, якія пагардліва адносяцца да скарг працоўных.

С. ЦЫПКІН.

ДОМ АДПАЧЫНКУ ДЛЯ ЦЯЖАРНЫХ.

У Сакольніках (Масква) ёсць выдатная ўстанова — дом адпачынку «Маскоўскі рабочы» для цяжарных. У доме адпачынку ўстаноўлен для адпачываючых спецыяльны рэжым: гімнастыка, якая ўмацоўвае мышцы жывата, штодзенны душ, спецыяльная дыета. Адпачываючыя знаходзяцца пад наглядам вопытных ураччоў-акушораў. Апрача таго асобы персанал абучае будучых мацярэй як пелянаць і даглядаць дзяцей. Тут-жа адпачываючыя атрымліваюць магчымасць падрыхтаваць усё «прыданае» для ўноўнароджанага. НА ЗДЫМКУ: адпачываючыя работніцы (злева направа) К. П. Леонава, інж. М. Ф. Кадымава, О. Ф. Чэцвярова і Т. Е. Міхеева рыхтуюць «прыданае» для ўноўнароджаных. Фото Л. Баця (Саюзфото).

# „ШТУРМЫ" НА АСІНТОРФЕ

Асінторф — тарфяны гігант Беларусі—перажывае штурмавыя дні. Па плану на 25 мая завод недадаў каля 38 тысяч тон торфу. З 29 брыгад па здабычы машынафармовачнага торфу толькі 5—6 брыгад выконваюць план. У глыбокім прарыве знаходзіцца і ўчастак вялікага гідраторфу. Аб прарыве тут гаворацць на кожным кроку, на вытворчых нарадах, агульных сходах, але ад гэтага не лягчэй.

Прарыў пачынаецца з «дробязей». Гэта падкрэслілі старшыня СНК БССР тав. Галадзед і нарком мясновай прамысловасці тав. Балцін, якія гэтымі днямі наведалі Асінторф. На машыне № 18, якую наведаў тав. Галадзед, не было вады для піцця. Звычайная вада ператваралася тут у цэлую «праблему». Ваду павінна падвозіць да машыны гаспадарчая частка, але яна тут не адчувае ніякай адказнасці.

На Асінторфе няма клопатаў аб жывых людзях, якія рашаюць план. У інтэрнатах усё яшчэ няма парадку, не хапае табурэтак, гадзіннікаў, пасцельных прылад і інш. Тарфяніку няма дзе памыць бялізну, няма пральняў. Зарплата даводзіцца да рабочага з вялікім спазненнем. А на фрэзерным участку наогул яшчэ блытаюцца, не ведаюць, з якога разліку выплачваць зарплату.

І не выпадкова, што на заводзе вялікая цякучасць. Начальнікі ўчасткаў не прыслухоўваюцца да голасу тарфянікаў, не задавальняюць іх справядлівых запатрабаванняў. Падамо некалькі прыкладаў.

Адзін з лепшых брыгадзіраў 2-га ўчастка тав. Красноўскі скардзіцца: «Я са сваёй брыгадай абавязаўся даць не менш 130 проц. плана штодзенна, але мы і 100 проц. не можам даць таму, што ў нас не хапае падкладачных дошак, казялкі не ў парадку (трасы штомінутна звальваюцца).

Брыгада тав. Козіка (машына № 11) 20 мая здабыла 71 тыс. паглін,—184 проц. новых норм. Стаханаўцы гэтай брыгады могуць яшчэ вышэй узняць сваю прадукцыйнасць, але-ж тут мы зноў сустракаемся з тэхнічнымі непаладкамі. У перадавой брыгадзе завода няма напільнікаў для точкі лапат, не ў паралку карчавальны ланцуг (прыходзіцца карчаваць рукамі), папсаваны карабельны ланцуг. Брыгада не мае магчымасці прасушыць спецвопратку пасля работы. Аб усім гэтым брыгада заявіла кіраўніцтву ўчастка яшчэ 20 мая. Прайшло дзесяць дзён, але-ж становішча не змянілася. Выкананне плана ў брыгадзе пайшло ўніз, больш 120 проц. плана не даюць.

Шматлікі інжынерна-тэхнічны персанал на Асінторфе сваёй непаваротлівасцю, кансерватызмам тармозіць правядзенне ў жыццё рашэнняў галіннай канферэнцыі па рацыяналізацыі і механізацыі вытворчасці. У многіх выпадках інжынерна-тэхнічны персанал не толькі не стварыў умовы і не ўзначаліў стаханаўскі рух, але стаў тормазам яго разгортвання.

Возьмем адно з рашаючых пытанняў — тэхвучоба. Яе на заводзе ўсё яшчэ няма. Большая частка рабочых першы раз на торфе. Яны не ведаюць тэхнікі, іх гэтаму не вучаць.

Вось брыгада Іванова (машына № 15), яна не выходзіць з прарыву. Людзі хочуць працаваць па-ўдарнаму, але не ведаюць, як расставіць рабочую сілу. Кожны дзень тарфянікі мяняюць сваё рабочае месца: сёння рабочы працуе на спілцы, заўтра на рольным стале і т. д. Многія брыгады не ведаюць, як арганізаваць правільна перасоўку машыны. У большасці брыгад перасоўка цягнецца не менш гадзіны.

У кожнай брыгадзе ёсць начальнік змены, на групу машын вылучаны начальнікі кар'ераў, але многія з іх канкрэтна не кіруюць брыгадамі, не вучаць іх, як правільна арганізаваць работу.

Каштоўнае абсталяванне вялікага гідраторфу ўтрымліваецца ў некультурным становішчы. Маторы брудныя, электраабсталяванне не закрыта, краны не ачышчаюцца.

З такім становішчам звыкліся інжынерна-тэхнічныя работнікі вялікага гідраторфу. Рабочым не прывіваецца навык у барацьбе за культуру рабочага месца і культуру ў жыцці. Адсутнасць барацьбы за культуру адчуваецца на кожным кроку—рабочыя нясуць свой брудны інструмент з работы проста ў інтэрнат таму, што няма дзе яго паставіць, а існуючыя кладоўкі без замкоў. У інтэрнаце няма пляцвацельніц, урнаў. Бакі з-пад вады цякуць і ад гэтага каля дзвярэй балота. На кожным пасёлку ёсць чырвоныя куткі, але ў іх заўсёды пуста і сумна.

У мінулым годзе на Асінторфе мелі месца антыдзяржаўныя тэндэнцыі, факты ашуканства дзяржавы. Гэта выразілася ў прыпісцы вялікай колькасці торфу.

Урокі мінулага года не ўлічаны. Асобныя кіраўнікі і ў гэтым сезоне прабуюць прыпісваць сабе торф.

6 мая ў начальніка змены на машыне № 7 выяўлена прыпіска 1.800 паглін торфу, 8 мая ў начальніка змены Шапіра—2.320 паглін. Дзесятніца фрэзернага ўчастка Кароўкіна прыпісала 17,4 тоны торфу. Начальнік змены Трубачоў 11 мая прыпісаў сабе лішніх 4.140 паглін торфу.

***

На Асінторфе ўжо ёсць дзесяткі людзей, якія паказваюць выдатныя ўзоры стаханаўскай работы (брыгада Козіка, Разумовіча, Благуша, Кухарэнкі, Шуманскага і інш.). На фрэзерным участку паасобныя брыгады даюць да 300 проц. нормы. Брыгады па сушцы торфу Нарчук, Зарубавай, Бацалёвай выконваюць новыя нормы на 150—200 проц.

Работа гэтых брыгад лішні раз пацвярджае, што план 1936 года па Асінторфу зусім рэальны, яго можна і патрэбна перавыканаць.

Партыя і ўрад стварылі ўсе ўмовы Асінторфу для выканання плана. Завод аснашчон навейшай тэхнікай торфаздабычы. Уся справа ў кіраўніцтве і арганізацыі людзей.

М. ФРУМКІН.

## БЕСЧАЛАВЕЧНАСЦЬ

(Пісьмо служачага)

Сям'я работніка РО НКУС тав. Чувашова (Свяцілавіцкі раён) з моманту арганізацыі раёна жыла на кватэры ў прыватніка Язерскага. Апошні рашыў выжыць сям'ю са сваёй кватэры. Для гэтага ён спачатку выняў вокны, потым разбурыў столь і, нарэшце, пачаў разбіраць будынак. Сям'і тав. Чувашова прышлося перасяліцца ў сарай разам з жывёлай.

Жывучы ў сараі, жонка тав. Чувашова ў ноч на 28 мая адчула, што ў яе наступаюць роды. Тады яна папрасілася да Язерскага ў хату. Апошні яе не пусціў. Муж быў у камандзіроўцы і жанчына парэ дзіла дзіцё ў сараі.

**БАЛТОЎСКІ.**

**АД РЭДАКЦЫІ:**

Здзіўляе выключная нячуласць праяўленая з боку начальніка РО НКУС тав. **ДАДЗІОНАВА**. Тав. Чувашоў яшчэ два гады таму назад скардзіўся, што яго сям'я жыве ў немагчымых умовах. А сам ён па сваёй рабоце знаходзіцца ў раз'ездах.

Замест таго, каб прыняць захады і забяспечыць свайго работніка належнымі кватэрнымі ўмовамі, тав. Дадзіонаў раўнадушна праходзіў міма фактаў здзек над сваім супрацоўнікам, якія працягваліся не адзін месяц.

Маці-рожаніца ў совецкай краіне з-за нячулых, бесчалавечных адносін да яе была пазбаўлена элементарных умоў і разам з нованароджаным прымушана была знаходзіцца ў сараі.

Зараз, пасля ўмяшацельства, сям'я тав. Чувашова ўселена ў другую кватэру, рожаніца паме шчана ў радзільны дом. Але чаму павінны застацца беспакаранымі кіраўнікі ўстаноў, якія не цікавяцца становішчам сваіх супрацоўнікаў і прыватнік, які дазволіў сабе дзіка здзекавацца над сям'ёй чэснага совецкага работніка?

## БЕСПАДСТАЎНАЕ ЗВАЛЬНЕННЕ

(Пісьмо рабочага)

На дарожным будаўніцтве я працую 27 год. З іх 21 год у якасці рамонтнага рабочага, а з 1930 года, пасля сканчэння курсаў, у якасці дарожнага майстра пры учдоры 702.

У сакавіку г. г. я захварэў на запаленне сядалішчнага нерва. Пасля хваробы, 19 мая, з'явіўшыся на работу, даведаўся, што былы начальнік учдора Гіндзін зволіў мяне за «няўку на работу», не гледзячы на бюлетэнь ад урача.

Новы начальнік катэгарычна адмовіўся аднавіць мяне на ранейшай рабоце.

**ЛЯЎКОВІЧ.**

## УПАРТЫЯ ЧЫНОЎНІКІ

(Пісьмо жонкі рабочага)

Сіламі жонак рабочых і служачых Копыльскай МТС вясной 1935 года пасаджан сад і зроблены клумбы. Але колькі мы ні прасілі, дырэкцыя не жадае абгароджваць гэты сад, матывуючы адсутнасцю сродкаў. Зараз многа дрэў паламана, клумбы без кветак.

**ЧУПРЫНАВА.**

## ПА СЛЯДАХ НЕАПУБЛІКАВАНЫХ ПІСЕМ

Пракурор Лёзнянскага раёна паведаміў рэдакцыю, што факты ў неапублікаванай заметцы тав. **Шаірка** аб праследванні стаханаўца Шатарэнка поўнасцю пацвердзіліся.

Калгаснік **Власенка** з калгаса «Канвеер», Глодаўскага сельсавета, за праследванне Шатарэнка асуджан на 8 месяцаў прымусовай работы.

***

Гр. **Мішкавец І.** скардзіўся рэдакцыі, што ў яго забралі маемасць і няправільна выключылі з калгаса «Чырвоная вёска», Колкаўскага сельсавета. Старшыня Капаткевіцкага РВК паведаміў нам, што Мішкавец адноўлен у калгасе. Маемасць сельсоветам яму вернута і сельгаспадатак пералічан як калгаснику.

***

Калгаснік **Мацюшэнка** пісаў, што калгасніцы калгаса «Усход», Сялібскага сельсавета, Бярэзінскага раёна, Доўгай, якая мае на сваім утрыманні 6 малых дзяцей, праўленне калгаса не дапамагае.

Старшыня Бярэзінскага РВК тав. **Махнач** паведамляе, што Доўгай і яе дзецям аказана грашовая дапамога.

Таксама дана распараджэнне калгасу аб забеспячэнні іх прадуктамі.

## ПА СЛЯДАХ ВЫСТУПЛЕННЯЎ «ЗВЯЗДЫ»

### «ПРАЦУЮЦЬ ПА-СТАРОМУ»

30 мая «Звязда» паведамляла, што Нараўлянскі райком партыі не перабудаваў сваёй работы і работы пярвічных арганізацый у адпаведнасці з указаннямі ЦК ВКП(б) і ЦК КП(б)Б.

З Нараўлянскага райкома партыі паведамілі нам, што гэта карэспандэнцыя абмяркоўвалася на пасяджэнні райкома.

Прананавана пярвічным арганізацыям па партыйных сходах абмеркаваць матэрыял «Звязды» і прыняць захады па паляпшэнню партыйнай работы.

Сакратару райкома тав. **Казачонку** даручана правесці нараду парторгаў і інструктароў райкома аб падрыхтоўцы да партыйных сходаў.

# КАЛГАСНЫ ГАРАДОК

Доўгая, абсаджаная маладымі бярозкамі, ясенем і клёнам вуліца. Паабапал вуліцы патанулі ў зелені садоў чатырыста сялянскіх хат. Многія з іх новыя, пабудаваныя годзе два, некаторыя гадоў тры таму назад, а большасць з іх старыя, але яшчэ здаровыя хаты. Супроць некаторых хат за прыгожымі агарожамі клапатлівыя маладыя дзяўчаты развялі клумбы, панасадзілі розных кветак. Амаль ва ўсіх хатах на вокнах павешаны беленькія, як снег, занавесачкі, стаяць вазоны...

Гэта вёска Залужжа. Але не тое Залужжа, якім было яно калісьці. Зараз гэта вёска ўся аб'яднана ў калгас імя Тэльмана. Зараз вёска Залужжа лічыцца калгаснай вёскай. І не проста толькі калгаснай вёскай, а заможнай культурнай калгаснай вёскай.

І беленькія занавескі на вокнах і клумбы супроць хат і маладыя дрэўцы паабапал вуліцы, — усё гэта з'явілася зусім нядаўна ў калгасным Залужжы, з'явілася тады, калі жыць стала лепш, жыць стала весялей.

Аб сваім радасным і вясёлым жыцці калгаснікі сельгасарцелі самі склалі і зараз спяваюць пад гармонік такія частушкі:

**Эх, іграй, іграй мілёнак,**
**Іграй на новыя лады!..**
**Жыццё красуе-весяліцца,**
**Прышлі шчаслівыя гады.**

**Колькі радасці і шчасця**
**У калгасе ў нас ужо!**
**Збудавалі нам советы**
**школы, яслі, клуб, кіно.**

***

Раней уся вёска Залужжа моцна трымалася старых рэлігійных звычаяў, вельмі верылі ўсякім забабонам. Сярод вёскі пабудавалі калісьці царкву, быў поп.

Прагналі сяляне калгаснай вёскі папа, а царкву пераабсталявалі пад клуб. А ў гэтым годзе тут устаноўлена гукавое кіно. Запытайце зараз у любога калгасніка і калгаснікі, вы пачуеце самыя найлепшыя водгукі аб кіно.

— Вось дзе харастро!.. Глядзім мы зараз розныя карціны.

— Глядзім і слухаем, — дадае другі калгаснік.

— Адбою няма ад людзей, калі толькі ставіцца кіно, кожны і стары, і малы хоча паглядзець...

— Шмат прагледзелі мы ўжо карцін. Больш за ўсё нам падабаюцца карціны пра нашу Чырвоную армію, пра героў грамадзянскай вайны... З вялікім захапленнем глядзелі ўсе «Мы з Кранштата» і асабліва фільм «Чапаеў».

Тут-жа, побач з кіно, фізкультурная пляцоўка. Раніцой і ўвечары кожны дзень і асабліва ў вольны ад работы час калгасная моладзь займаецца фізкультурай.

А вось і дзіцячыя яслі. У новым доме чыста і ўтульна. На вокнах беленькія занавескі, новенькія дзіцячыя ложкі, засланыя чыстай пасцеллю. Каля дома прыгожая пляцоўка, абсаджаная маладымі дрэвамі. На пляцоўцы пад ласкавымі праменнямі сонца і пад кудравымі бярозкамі бегае калгасная дзетвара. Дзеці так прывыклі да яслей і пляцоўкі, так здружыліся паміж сабою, што не хочуць ісці ўвечары дадому.

— Нам тут весела, у нас цацкі розныя ёсць, — хваліцца пяцігадовы Вася.

— А мы спяваем розныя песні...

І для таго, каб упэўніць, што яны на пляцоўцы спяваюць песні, белакуры хлапчук Алёша зацягвае звонкім галаском.

«По долинам, по загорьям шла
дивизия вперед...

А чатырохгадовая Лена паказвае прыезджым дзядзям:

— Паглядзіце, якая ў мяне прыгожая сукенка!... Гэта мне купіла мама ў капіраціве.

***

Весела і прыгожа ў калгасе імя Тэльмана ўвечары. Доўгая шырокая вуліца асвятляецца электрычным святлом, праз вокны з хат калгаснікаў таксама прабіваецца на вуліцу электрычнае святло. Скотныя двары, свірны, канцэлярыя калгаса, клуб таксама асветлены электрычнасцю. Сярод калгаса стаіць невялічкая электрастанцыя, якая працуе круглыя суткі: удзень яна прыводзіць у рух лесапільны станок, а ўвечары асвятляе ўвесь калгас.

Калі прайсціся ўвечары па калгасу імя Тэльмана, можна заўважыць: у клубе заняткі якога-небудзь гуртка, у бібліятэцы—калгаснік або калгасніца выбірае сабе кнігу чытаць, сям-там калгаснікі дома чытаюць газету, або кнігу, чуваць радыё... Дзесьці раздаюцца гукі гармоніка, а ў тахт іх льюцца вясёлыя і радасныя песні калгаснай моладзі.

Ну, проста калгасны гарадок!

Электрычнасць асабліва падабаецца калгаснікам. Не здарма-ж яны склалі і спяваюць зараз, хоць не зусім складныя, але затое шчырыя прыпеўкі:

**Нам ўжо сонейка**
**прыгрэла,**
**і сады ўжо**
**расцвілі.**
**У калгаснікавых хатах**
**электрычнасць правялі...**

Цяжка знайсці ў калгасе аўтара ўсіх прыпевак, якія спявае моладзь і нават дзеці. І зусім зразумела. Песні і прыпеўкі гэтыя складаюцца ўсімі калгаснікамі.

***

...Патануўшыя ў зелені садоў сялянскія хаты. Доўгая шырокая, абсаджаная дрэвамі вуліца... Увечары сотні электрычных лямпак... Гукавое кіно, узорныя яслі, школа, фізкультурная пляцоўка, цырульня...

Гэта калгас імя Тэльмана, Старадарожскага раёна. Гэта тут былыя беларускія белнякі і сераднякі, аб'яднаўшыся ў калгас, дабіліся заможнага і культурнага жыцця.

**С. СЯМАШКА.**

Капыльская каапераця арганізавала продаж літаратуры непасрэдна ў калгасах раёна. НА ЗДЫМКУ: калгаснікі арцелі «Ільіч», Бабаўнянскага сельсавета, разглядаюць кулленыя імі кнігі. Фото МАЛЮКЕВІЧА.

## НАБЛІЖАЕЦЦА ЧАС УБОРКІ ЎРАДЖАЮ

Камбайнер Штэйнгартаўскай МТС, Азова-Чорнаморскага края ордэна Сталіну абавязацельства ўбраць не менш 800 гектараў на камбайне «Комунар», атрымаў камбайн «Сталінец», на якім ён абавязаўся ўбраць 1.800 гектараў. НА ЗДЫМКУ: тав. Борын і нам. дырэктара МТС па палітчасці тав. Іваноўскі аглядаюць пасевы на ўчастках, замацаваных для ўборкі за тав. Борыным. Фото Кадзімава

Камбайнер Штэйнгартаўскай МТС, Азова-Чорнаморскага края ордэна носец тав. Борын, які даў таварышу Борын, атрымаў камбайн «Сталінец», на якім ён абавязаўся ўбраць не менш 800 гектараў. НА ЗДЫМКУ: тав. Борын Канстанцін (справа) і нам. дырэктара МТС па палітчасці тав. Іваноўскі аглядаюць пасевы на палях калгаса імя Горкага на (Саюзфото).

## ХТО КІРУЕ БУДАЎНІЦТВАМ

СМАЛЯВІЧЫ. (Спец. кар. «Звязды»). Да ўборачнай калгас «Прагрэс» павінен пабудаваць гумно. З ранняй вясны калгаснікі загатовілі матэрыял, і як толькі адтала зямля, укапалі шулы. Будавалі гумно на 40 метраў даўжыні і 9 метраў шырыні.

Калі будыніна была выведзена да страхі, у калгас прыехалі работнікі райземаддзела. Яны агледзеліся, што гумно будуецца не па праекту. Старшыню калгаса Філіповіча выклікалі на прэзідыум райвыканкома. Старшыня РВК і загадчык райземаддзела добра пасварыліся па старшыню калгаса: як гэта ён не ведаў, што трэба будаваць гумно не менш, як на 100 метраў даўжыні і 18 метраў шырыні? А т. Філіповіч не ведаў па простай прычыне — яму ніхто гэтага не сказаў.

Будаўніцтва гумна было спынена. У раёне паабяцалі прыслаць тэхніка, або дзесятніка, які павінен агледзець будыніну. І вось блізка месяц як у калгасе чакаюць тэхніка, а гумно стаіць незакончаным.

Гэты факт сведчыць аб тым, як у раёне кіруюць будаўніцтвам у калгасах. Будаўніцтва праходзіць самацёкам. А ў выніку многа прарываў.

У калгасах па плану райземаддзела неабходна пабудаваць 6 гумнаў. Пачалі будаваць 18. Але ні адно гумно яшчэ не закончана. А ў радзе калгасаў, у тым ліку і «Прагрэсе», будаўніцтва спынілася.

Зусім сарвана будаўніцтва малацільных навесаў. У раёне лічаць навесы зусім непатрэбнымі.

Да першага чэрвеня павінна быць пабудавана 15 зернасушылак сістэмы інжынера Уварава. Да будаўніцтва, як заяўляе тэхнік-будаўнік **Пінязёў**, прыступілі толькі ў канцы красавіка. Але і за гэты месяц ні адна зернасушылка не пабудавана. Як дасягненне лічаць тое, што ёсць 8 каробак зернасушылак. Гэтыя так званыя «каробкі» падабраны з старых будынін, якія ў большасці не прыгодны для сушкі зярна. Цэгла ні для адной зернасушылкі не загатоўлена.

У калгасе «Новае жыццё», Верхменскага сельсавета адмаўляюцца будаваць сушылку. У калгасе «Пралетарскі ўдарнік» праект зернасушылкі прыбілі ў калідоры да сцяны. Такі лёс праект зернасушылкі напаткаў і ў калгасе «Новая зара», Жодзінскага сельсавета. Тут праектам накрылі ў канцэлярыі стол.

Райземаддзел не арганізаваў будаўніцтва ў калгасах. Загадчык райземаддзела т. Нішчык не ведае, што робяць тэхнікі-будаўнікі і дзесятнікі. Іх работай ён цікавіцца толькі тады, калі патрэбны весткі аб будаўніцтве.

Не цікавіцца будаўніцтвам у калгасах раённы камітэт партыі і райвыканком. Яны нічога не прадпрынялі па ажыццяўленню пастановы СНК СССР і ЦК ВКП(б) аб арганізацыйна-гаспадарчым умацаванні калгасаў нячорназёмнай паласы.

**А. ЛОСЬ.**

## ПАРНІКІ У КАЛГАСЕ

На ўскраіне горада размясцілася парніковая гаспадарка калгаса «Чырвоны гароднік». Пад чатырма тысячамі рам растуць гуркі, памідоры, радыс, салат, пятрушка, цыбуля, капуста.

«Усю зіму, калі на дварэ стаяў моцны мароз, — гаворыць парнікавод **Грыгорый Новаш**, — мы мелі свежую, зялёную цыбульку, радыску, цвятную капусту. А гэта ў нас ужо другі ўраджай».

Парнікавод перш за ўсё паказвае свае цяпліцы, дзе ў самыя лютыя маразы расце гародніна. Цяпліца ў прамёнях сонца. У спецыяльных градках разрасліся гуркі. Адны толькі завязаліся, другія ўжо выраслі. Яшчэ 18 красавіка адсюль пачалі знімаць новы ўраджай гуркоў.

У цяпліцах растуць таксама памідоры, цвятная капуста. Памідоры ўжо вялікія і пачынаюць паспяваць. Праз месяц яны паступяць на рынак. Капуста зацвіла, яна вырошчваецца на насенне. Адзін кілограм насення каштуе вельмі дорага, і таму парнікавод Новаш рашыў вырасціць насенне ў сваёй цяплушцы.

Пад гуркі на парніках занята 3.500 рам. Тут гуркі разрасліся на дзіва. З 1 мая кожны дзень выбіраюць іх і вывозяць на рынак. Апошнія дні калгас збірае з рам па 240 кілограмаў гуркоў.

У парніках вырасла салата, якой штодзень прадае калгас па 50—60 пудоў, цыбуля, пятрушка, салата. На сваім гародзе калгас высадзіў 30 тысяч шт. памідораў, 60 тысяч шт. расады капусты, вырашчанай у парніках.

Кожны год парнікі даюць калгасу вялікі прыбытак. У мінулую вясну ад праданай гародніны з парнікоў выручана 108 тыс. руб. Сёлета калгас мяркуе атрымаць прыбытку ад парнікоў не менш 120 тыс. руб.

Вялікую работу на парніках праводзіць парнікавод тав. Новаш Грыгорый Нікалаевіч. Ён зрабіў гэту галіну калгаснай гаспадаркі самай прыбытковай.

Менскі раён.

**А. Л.**

## УКЛЮЧАЕМСЯ ВА ЎСЕСАЮЗНАЕ СПАБОРНІЦТВА

Мы, трактарысткі жаночай трактарнай брыгады бешанковіцкай МТС, абмеркаваўшы пастанову ЦК ВЛКСМ і Наркамзема СССР аб усесаюзным спаборніцтве жаночых трактарных брыгад на лепшыя паказальнікі па выпрацоўцы трактараў, эканоміі гаручага і ўзняцці культурна-тэхнічнага ўзроўню жанчын-трактарыстак, уключаемся ва ўсесаюзнае спаборніцтва і бярэм на сябе абавязацельства павысіць выпрацоўку трактараў не менш чым на 20 проц. супроць плана.

Мы працуем першы год і ўжо за веснавую сяўбу выпрацавалі 200 гектараў на кожны трактар супроць плана 96 гектараў. Маем эканомію гаручага. Аварый у нас не было і ў далейшым не дапусцім. Абавязваемся таксама знізіць сабекошт работ не менш чым на 20 проц. супроць устаноўленых планавых норм.

У нашай брыгадзе тры новыя трактары ХТЗ з новым прычэпным інвентаром. Працуем у калгасах імя Кірава, імя Калініна і імя Будзённага, Свечанскага сельсавета, Бешанковіцкага раёна. За перавыкананне норм выпрацоўкі і эканомію гаручага некаторыя з нас, як напрыклад, Кавалёнак Натапа і Кавалёнак Ліза, прэміраваны дырэкцыяй МТС. Тэмпаў у рабоце не зніжаем. Работу здаем і будзем у далейшым здаваць высокай якасці.

Зараз, у сувязі з уключэннем ва ўсесаюзнае спаборніцтва жаночых трактарных брыгад, мы яшчэ лепш будзем глядзець за чыстатой трактара і за культурнасцю ў рабоце кожнай трактарысткі.

**ТРАКТАРЫСТКІ: КАВАЛЁНАК Наташа, КАВАЛЁНАК Ліза, БЕЛАУС Ніна, КУХТА Марыя, ГОЛЫНЯ Прося, МАТОРА Елена,**

**Брыгадзір ФЁДАРАЎ Аляксей.**

## НА ПАЛЕССІ ПАЧАЛАСЯ КАСЬБА

**МАЗЫР.** (Па тэлефону). Многія калгасы Мазырскай акругі пачалі касьбу балотных лугоў выбарачным парадкам. Сельскагаспадарчая арцель «Надубава Чарэчанка», Жыткавіцкага раёна, скасіла 25 гектараў сенажаці. На 15 гектарах трава высушана і застагавана. Вышлі на касьбу калгасы «XVII партз'езд», «Авангард», імя Сталіна. Яны скасілі па 10—15 гектараў балотнай сенажаці.

У Нараўлянскім раёне першым пачаў касьбу калгас «Ударнік», Дзямідаўскага сельсавета. Ранняя касьба праводзіцца ў мэтах загатоўкі добраякаснага корму для жывёлы.

**Р. ФРАЛОЎ.**

## НА КУЛЬТУРНЫЯ ТЭМЫ

***

### 1. ЦІКАВЫ І ВЯСЕЛЫ АДПАЧЫНАК

Скончан працоўны дзень. Шматлікі калектыў рабочых менскай абутковай фабрыкі імя Кагановіча разыходзіцца ва ўсе бакі горада. Большасць з іх спяшаецца дамоў, каб адпачыць і пайсці ў свой фабрычны летні сад пачытаць газету або паслухаць цікавую лекцыю.

Летні сад фабрыкі пачаў сваю работу з 15 мая. Асноўная яго задача—працаваць так, каб рабочы ў вольны час разам са сваёй сям'ёй мог культурна і весела адпачыць.

У гэтым напрамку ўжо зроблены першыя крокі. Сад прыведзен у належны выгляд. Пабудован рад цікавых атракцыёнаў (камічны бокс, вудачка, гергіцкая барацьба і т. д.). Набыты тамакі. Тут можна і пачытаць цікавую кніжку, свежую газету, паіграць у шахматы, шашкі, даміно. Абсталяван і пакой стаханаўцаў.

Арганізоўваецца рад масавых лекцый. Заключаны дагавары з Беларускай акадэміяй навук. Прыкладна будуць прачытаны лекцыі аб ленінска-сталінскай нацыянальнай палітыцы, аб гісторыі рэвалюцыйнага руху ў Беларусі і рад іншых.

Няма летняга «зацішша» і ў рабоце клубных гурткоў. Яўрэйскі драмгурток падрыхтаваў аднаактавую п'есу, прысвечаную 20-годдзю смерці яўрэйскага пісьменніка Шолам-Алейхема.

Рускі драмгурток ставіць новую пастаноўку ў чатырох актах «Жаніцьба бравага салдата Швейка». Прымае ўдзел 20 чалавек. Нядрэнныя поспехі і ў балетнага гуртка, ён рыхтуе украінскі «гапак» і рад сольных нумароў. Не адстаюць ў рабоце струнны і харавы гурткі.

Зараз разгорнута шырокая падрыхтоўка да ўсесаюзнай мастацкай алімпіяды рабочай самадзейнасці скурна-абутковай прамысловасці.

Летні сад фабрыкі імя Кагановіча прарабіў вялікую работу, але гэта яшчэ толькі першыя крокі, і абмежавацца гэтым нельга. Трэба дабіцца таго, каб сад зрабіўся сапраўдным культурным ачагом рабочых фабрыкі.

**Н. ДАВЫДАВА.**

### 2. ПАСЛЯ ДОЎГІХ РАЗМОЎ

Цэнтр раёна ад чыгуначнай станцыі як рукой падаць. Праз кожныя тры гадзіны тут праходзяць паязды, сотні новых людзей бывае ў раёне кожны дзень.

Часта ў Лёзне склікаюцца нарады, канферэнцыі, праводзяцца алімпіяды, многа гавораць аб культурнасці ў калгасах, у хатах калгаснікаў, гавораць аб скверах, палісадніках, пахучых кветках. Што-ж робіцца ў самым раённым цэнтры?

Пачнем з вуліц. Калі глядзець здалёк, то і тратуары, як тратуары, а папрабуйце ісці па іх. Ідзеш, а тут і глядзі, каб нагу не зламаць. Ступіш на адзін канец дошкі, другі на дыбы становіцца.

Па дарозе заходзім ў местсавет. Тут няўтульна, брудна.

Вечарам заходзіш у кінатэатр. Купляем білет і шукаем сваё месца, але яго няма—яно занята.

Усё ў зале «сціхае». Кіномеханік выключае святло і вы ўпіваецеся ў белае палатно-экран. Але і тут некультурнасці больш, чым дзе. Як толькі выключаецца святло, пачынаецца трэск, пляванне, шум. Вы гэтаму не здзіўляйцеся. У Лёзне так і прынята, што білет купіў, а садзіся, дзе папала і слухай, як некаторыя глядачы трускаюць зубамі арэхі, выплёўваюць шалупінне.

У самым цэнтры раёна ёсць сталоўка, побач універмаг, кніжны магазін, а яшчэ праз пару крокаў сельскагаспадарчы склад. За брудам, скрынкамі і бочкамі не відаць гэтых памяшканняў. Насупроць другі раймаг і тут-жа за крокаў 50 прыбіральня.

Пасля ўсяго гэтага вам хочацца адпачыць і вы ідзеце ў лёзнянскі «парк». Агарожа тут раскідана, не больш 5—7 лавак на ўвесь «парк». Свінні цэлы дзень снуюць, перарываюць траву. Ні кветак, ні клумбаў тут не знойдзеш. Моладзі ў Лёзне адпачываць няма дзе.

**В. ТУРАВЕЦ.**

### 3. НЕ ПАРЫВАЦЬ СУВЯЗЬ

Пасля пастановы бюро ЦК КП(б)Б аб разгортванні культасветнай работы на вёсны гомельскі музтэхнікум сур'ёзна ўзяўся за яе правядзенне ў жыццё.

Былі складзены дзве брыгады з настаўнікаў і студантаў, перад якімі паставілі задачу — арганізаваць культурны адпачынак калгаснікам і рабочым соўгасаў і дапамагчы ім наладзіць работу гурткоў мастацкай самадзейнасці.

Сіламі брыгад у калгасах і соўгасах Цярэшкаўскага, Урыцкага, Даманавіцкага і інш. сельсоветаў былі падрыхтаваны рад гурткоў да раённай і ўсебеларускай алімпіяды калгаснай і соўгаснай самадзейнасці. Развучваліся новыя рэвалюцыйныя і класічныя песні, арганізоўваўся рад вечароў, якія праходзілі ажыўлена. Шляхам кансультацыі аказалі значную дапамогу ў рабоце гурткоўцаў.

Трэба, каб тэхнікум і надалей падтрымліваў сувязь з калгаснымі і соўгаснымі гурткамі самадзейнасці і дапамагаў ім у рабоце.

**П.Р.Л.**

# ПРАВІЛЬНА РАЗМЕРКАВАЦЬ ПЛЕМЯННУЮ ЖЫВЁЛУ

Развядзенне пародзістай высокапрадукцыйнай жывёлы і метызацыя мясцовай жывёлы адыгрывае асабліва важную ролю ў ліку агульных мерапрыемстваў партыі і ўрада па развіццю жывёлагадоўлі. Аб важнасці справы развіцця племянной жывёлагадоўлі сведчаць пастановы ЦК ВКП(б) і Соўнаркома СССР аб. развіцці тонкарунной аўцагадоўлі і аб плане продажу калгасам племянных быкоў і аб кастрацыі быкоў у соўгасах. Гэтыя велізарнейшага палітычнага значэння дакументы павінны прыцягнуць увагу раённых партыйных і совецкіх арганізацый і ў першую чаргу земельных работнікаў да пытанняў развіцця высокапрадукцыйнай племянной жывёлы.

Згодна рашэнняў партыі і ўрада завоз племянной жывёлы—бараноў, свіней, буйнай рагатай жывёлы—у раёны БССР у гэтым годзе ў некалькі раз перавышае завоз мінулых гадоў. Трэба гэту жывёлу прыняць, правільна размеркаваць яе ў калгасах. Трэба сям-там зламіць косныя адносіны, а часамі і прамое супраціўленне метызацыі жывёлы.

Там, дзе зразумелі ўсё значэнне развіцця племянной жывёлагадоўлі, дзе самі кіраўнікі раёна асабіста займаюцца гэтым пытаннем, там і справа рушыцца. У Тураўскім раёне поўнасцю ўжо заключаны дагавары з калгасамі на завазімую ў 1936 годзе племянную жывёлу. Калгасы не толькі неадкладна разлічваюцца за завазімую племянную жывёлу, але і ўзмоцнена пераводзяць авансы. Загадчык райза тав. **Краўчанка** асабіста правярае, як размяркоўваецца племянная жывёла па калгасах, як яна аплачваецца і т. д.

Старобінскі райза (загадчык тав. **Юнкер**) таксама паказвае большавіцкія ўзоры барацьбы за развіццё племянной жывёлагадоўлі. Не гледзячы на тое, што ў раён завозіцца вялікая колькасць племянной жывёлы (каля 300 галоў), тут ужо закончваюць заключэнне дагавароў, і калгасы перавялі 20.000 руб. авансаў у лік аплаты за жывёлу.

З перадавых раёнаў, дзе ёсць сапраўды большавіцкія клопаты аб племянной справе, трэба адзначыць Брагінскі і Глускі раёны, якія ўжо заканчваюць заключэнне дагавароў і перавялі значныя сумы авансаў.

Але, на жаль, далёка не ва ўсіх раёнах так абстаіць справа.

У Кіраўскім раёне пры параўнальна невялікім плане завозу племянной жывёлы да гэтага часу дагаворы заключаны менш чым на палову. Завезеная ў сакавіку і пачатку красавіка гэтага года племянная жывёла (бараны і свінні) на суму 22 тысячы рублёў да гэтага часу не аплочана. І гэта ў той час, калі 17 тысяч рублёў крэдыту, адпушчанага калгасам на гэту справу ў другім квартале, зусім не выкарыстоўваюцца.

Уваравіцкі раён, не гледзячы на наяўнасць 8 тысяч крэдыту, да гэтага часу не пакрывае яшчэ сакавіцкай запазычанасці за завезеную племянную жывёлу. У раёне зусім дрэнна ідзе справа з заключэннем дагавароў.

У Бабруйскім раёне на завазімыя 150 кныроў заключана толькі 25 дагавароў; на буйную рагатую жывёлу, якой завозіцца 42 галавы, яшчэ не заключана ні аднаго дагавору. Пры наяўнасці 22 тысяч рублёў крэдытаў на племянную жывёлу ў бягучым квартале раён не перавёў ні адной капейкі авансаў і мае запазычанасць за племянную жывёлу ў 12 тысяч рублёў.

І Кіраўскі, і Уваравіцкі, і Бабруйскі райвыканкомы добра ведаюць аб такім ганебным становішчы, са справай рэалізацыі племянной жывёлы ў раёне, нават выносілі адпаведныя пастановы. Але гэта толькі для самасупакаення. Рашэнні, вынесены, іх ніхто не выконвае, і справа не рушыцца. Хіба так трэба змагацца за рэалізацыю рашэнняў партыі і ўрада?

Здзіўляючы прыклад супраціўлення рашэнням партыі і ўрада аб племянной жывёлагадоўлі паказвае Хойніцкі раён. Хойніцкі райза (загадчык райза **Завадскі**, старшы зоатэхнік **Ануфрыеў**) двойчы ўхітрыўся аспрэчваць планы завозу кныроў і бараноў у раён. І зараз, калі Наркамзем БССР даў рашучы адпор такім тэндэнцыям, у райза яшчэ моцна ўпэўнены, што завазімыя бараны і кныры ім «навязваюць», што нядрэнна было-б гэты завоз скараціць і т. д. Гэтыя настроі сказваюцца і ў практычнай рабоце: крэдыты на племянную жывёлу калгасамі да гэтага часу не афармлены, дагавары заключаны толькі на палову завазімай жывёлы. Да гэтага часу райза яшчэ і не думаў пах тым, дзе будуць размеркаваны завазімыя свінаматкі. Завазімая племянная жывёла прастойвае па 2—3 тыдні перэалізаванай, і калгасы за пракорм яе вымушаны даплачваць яшчэ амаль 1/3 кошту самой жывёлы. На мабілізацыю сродкаў за завезеную племянную жывёлу не звачаецца ніякай увагі. За кныроў, завезеных у сакавіку, раён да гэтага часу не пагасіў і паловы запазычанасці.

Такія адносіны да выканання важнейшых указанняў партыі і ўрада пагражаюць не толькі зрывам планаў развіцця племянной справы ў гэтых раёнах, але і тармозяць выкананне планаў завозу племянной жывёлы 1936 года па ўсёй рэспубліцы. Даволі ўказаць хоць-бы на тое, што па адной толькі зоне абслугоўвання жлобінскай міжраённай племзаготканторы (30 раёнаў) запазычанасць за раёнамі за завезеную племянную жывёлу складае 180 тысяч рублёў.

Для таго, каб пакончыць з такім ганебным становішчам і выканаць з поспехам план развіцця племянной справы ў 1936 годзе, трэба, каб кожны кіраўнік раёна і асабліва кіраўнікі райза цвёрда ўсвоілі сказанае таварышом Сталіным на XVII партз'ездзе: «Справу развіцця жывёлагадоўлі павінны ўзяць у свае рукі ўся партыя, усе нашы работнікі партыйныя і беспартыйныя».

**Б. ЛЕВІНЧЫК.**

## ТЭЛЕГРАМА ЎДЗЕЛЬНІЦ КОННАГА ПЕРАХОДУ ХАРКАЎ—КІЕЎ—МЕНСК—МАСКВА

**МЕНСК, РЭДАКЦЫЯ «ЗВЯЗДЫ»**

ЛЯДЫ (АРШАНЧЫНА), 3 чэрвеня. (Па тэлеграфу). Пакідаючы брацкую Беларусь, удзельніцы коннага пераходу Харкаў — Кіеў — Менск — Масква шлюць гарачае прывітанне і падзяку працоўным і кіраўнікам гаспіннай Совецкай Беларусі. Выдатныя, хвалюючыя, поўныя ўвагі сустрэчы, выключнае абслугоўванне, якое мы сустрэлі, з'яўляюцца для нас стымулам да пераможнага фінішу ў сталіцы Саюза ССР — Маскве. Наша дзякуй братам-пагранічнікам Беларусі, якія праявілі да нас выключныя клопаты і ўвагу. Таксама пасылаем гарачую падзяку клапатліваму, чуламу камбрыгу Емельянаву.

**ЖОНКІ КАМАНДЗІРАЎ-ПАГРАНІЧНІКАЎ, УДЗЕЛЬНІЦЫ КОННАГА ПЕРАХОДУ ХАРКАЎ — КІЕЎ—МЕНСК—МАСКВА.**

## АКРУГОВАЯ НАРАДА ЖОНАК КАМАНДЗІРАЎ-ПАГРАНІЧНІКАЎ

З 4 па 8 чэрвеня ў часцях пагранічнай аховы НКУС БССР будуць адбывацца нарады жонак камандніка і начальніцкага складу для абгаварэння культурна-бытавых пытанняў. 10 чэрвеня ў Менску склікаецца акруговая нарада жонак камандніка і начальніцкага складу войск пагранічнай і ўнутранай аховы НКУС БССР. На парадку дня пытанні аб школьным і дашкольным выхаванні дзяцей, аб барацьбе за культуру быта і павышэнне палітычнага і адукацыйнага ўзроўню, аб абарончай рабоце і мастацкай самадзейнасці. У рабоце нарады прымуць удзел каля 100 чалавек.

## ЖОНКІ СПЕЦЫЯЛІСТАЎ АРГАНІЗАВАЛІ ПІОНЕРСКІ ЛАГЕР

Па ініцыятыве жонак інжынерна-тэхнічных работнікаў на бабруйскім фанерным заводзе імя Кірава арганізаваецца піонерскі лагер, які прапусціць (за два змены) 240 дзяцей. Завод пабудаваў з фанерных шчытоў домікі-палаткі. На ўтрымание лагера адпушчана 15 тыс. руб. За арганізацыяй адпачынку дзяцей і за культурным утрыманнем лагера будуць сачыць і дапамагаць жонкі інжынерна-тэхнічных работнікаў.

## ПРЭМІРАВАННЕ ЎДЗЕЛЬНІКАЎ МАСТАЦКАЙ САМАДЗЕЙНАСЦІ ХОЙНІЦКАЙ МТС

З вялікім поспехам прайшлі выступленні калектыва мастацкай самадзейнасці Хойніцкай МТС на ўсесаюзнай алімпіядзе рабочых МТС у Харкаве (23—29 мая). Калектыву прысуджана першая прэмія. Кіраўнік калектыва тав. Лявіцкі прэміраван 300 руб., па 150 руб. атрымалі выканаўца беларускіх народных песень Анастасія Жэўняк і яе 11-гадовая дачка Ларыса. Цэнтральнае праўленне профсаюза рабочых МТС БССР вылучыла для ўдзельнікаў калектыва тры путёўкі ў дамы адпачынку і адну путёўку на курорт.

# Торфаразелячэнне ў БССР

Разелячэнне з'яўляецца адным з вельмі распаўсюджаных і эфектыўных метадаў уздзеяння на хворы арганізм, прымяняемае, галоўным чынам, на курортах пры цэлым радзе хранічных захворванняў. Як вядома, у СССР найбольшай папулярнасцю карыстаюцца ілавыя лімаўныя разі Крыма і Одэсы. У Заходняй Еўропе вельмі распаўсюджан спосаб лячэння тарфяной граззю (Марыенбад, Францэсбад, Тепліц, Бадэн, Барботан і інш.). Тарфяной граззю ў нас карыстаюцца на курортах у Ліпецку, Кашыне, Краінку, Міргарадзе, Варзіятчах. Выключная тэрапеўтычная важнасць і эканамічная мэтазгоднасць наблізіць разелячэнне да шырокіх мас хворых, якія адчуваюць у гэтым патрэбу, і таксама несумненныя поспехі торфаразелячэння паставілі на чаргу пытанне аб скарыстанні тарфяных покладаў БССР для лячэння.

Усесаюзным балотным інстытутам былі арганізаваны даследванні тарфяных балот ля гарадоў: Менска, Бабруйска, Оршы, Барысава, Магілева, Гомеля і Віцебска. Усяго было абследвана 61 балота і ўзята звыш 500 узораў для розных аналізаў. Пробы потым падрабяна даследваліся ў хіміка-фізічнай лабараторыі курортнага сектара Гіфона (навукова-даследчы інстытут фізіятрыі, курорталогіі, траўматалогіі, псіханеўралогіі). Як выявілася, БССР уладае дастатковым запасам торфаразей з вялікай ступенню разлажэння. Многія з гэтых гатункаў разей па сваіх знешніх уласцівасцях—пластычнасці, вязкасці, гамагеннасці і адсутнасці засмечанасці—набліжаюцца да ілавых разей і, што асабліва важна, могуць быць прыменены ў выглядзе сырцу без усякай папярэдняй апрацоўкі, як гэта мае месца ў большасці курортаў. Апошняя акалічнасць з'яўляецца вялікай перавагай у лячэбных якасцях торфаразей БССР. Цяпер ужо ёсць магчымасць на падставе гэтых даных весці добра арганізаванае торфаразелячэнне амаль ва ўсіх вялікіх гарадах БССР, якія могуць карыстацца выяўленымі покладамі лячэбных торфаразей.

З 1934 г. у разелячэбніцы Гіфона (загадчык д-р Захарава) вядуцца сістэматычныя наглядання над торфалячэннем. У якасці торфаразевай масы ўжываецца торфсырэц (без папярэдняй мінералізацыі і асобнай апрацоўкі) з так званага Сляпянскага балота.

Методыка торфалячэння ў асноўным тая-ж, што і пры карыстанні ілавай граззю. Торф злёгку ўвільгатняецца да атрымання цестападобнай кансістэнцыі, награваецца ў вадзяной лазні да 60 градусаў па Цэльсію, потым уручную змешваецца з халоднай торфаразаю да патрэбнай тэмпературы (ад 45 град. да 53 град. па Цэльсію) і ў выглядзе аплікацый (ляпёшак), слоем да і інш. аскладненні тут радкі. Усяго 5 сант., накладваецца непасрэдна на цела хворага. Разевая ляпёшка закрываецца паслядоўна палатном, цыратай, прастынёй, коўдрай і пакідаецца на хворым да 30 мінут. Пасля працэдуры даецца цёплы дажджавы душ і адпачынак. Даўжыня лячэбнага курсу ад 6 да 18 працэдур.

Што дае нам параўнанне торфаразевых аплікацый з ляпёшкамі з ілавай (прывозной) разі?

Тарфяная маса той-жа самай тэмпературы, што і ілавая свабодна пераносіцца хворымі. Астываемасць яе на хворым амаль такая-ж. Аднак вага торфаразі значна меншая. Торфмаса серавадарода ў вялікіх колькасцях не выдзяляе. Перанасімасць торфаразевых працэдур значна лягчэй, чым разе-ілавых. Скаргі на галаўную боль, агульную разбітасць, стомленасць, сэрцабіенне не аб арганізацыі ў БССР одантаалягічнага (зубаўрачэбнага) інстытута ў сучасны момант вырашаецца ў адпаведных саюзных і рэспубліканскіх урадавых установах.

Торфаразелячэнне прымянялася, галоўным чынам, пры хранічным сустаўным рэўматызме і іншых захворваннях суставаў, пры неўралгіях (іншыяс) і запаленнях нерваў розднага паходжання, пры некаторых паслятраўматычных пашкоджаннях, пасляаперацыйных спайках і т. д. Агульная эфектыўнасць ад рэзультатаў торфаразелячэння выявілася ў лічбах: паляпшэнняў 87,8 проц., абвастрэнняў 3 проц., без змен 9 проц. Тэрапеўтычная эфектыўнасць, атрыманая інстытутам за 3 гады карыстання прывознай ілавай (одэская) граззю, зводзілася да 83,5 проц. паляпшэнняў і 7,1 проц. абвастрэнняў.

Падводзячы вынікі торфаразелячэнню ў Гіфоне, можна зрабіць наступныя вывады:

торфаразелячэнне ўпаўне замяняе ілавае разелячэнне амаль пры ўсіх адпаведных захворваннях;

тэрапеўтычная эфектыўнасць пры торфаразелячэнні не ніжэй чым пры карыстанні ілавай граззю;

малая колькасць абвастрэнняў пры торфалячэнні і лёгкая перанасімасць хворымі працэдур даюць магчымасць пашырыць паказанні да лячэння пры адборы хворых.

Торфалячэнне павінна шырока ўвайсці ў практыку існуючых фізіятэрапеўтычных і іншых лячэбных устаноў БССР і павінна ўключацца ў план праектуемых як лячэбны метад, які ў нашых умовах лёгка ажыццявімы амаль усюды і які можа ўпаўне замяніць па-закурортнае разелячэнне. У Менску наспела неабходнасць у пабудове спецыяльнай торфаразелячэбніцы на базе аколічных покладаў, з прапускной здольнасцю ў 150—200 чалавек у дзень.

Праф. Д. А. МАРКАЎ.



Падрыхтоўка да здачы норм на варашылаўскага страпка ў палявым стане калгаса «Сталінскі путь», Багатоўскага раёна, Куйбышэўскага краю. (Саюзфото).

## АБ ПАДРЫХТОЎЦЫ ЗУБАЎРАЧЭБНЫХ КАДРАЎ

Народны камісарыят аховы здароўя БССР у адказ на артыкул «Падрыхтоўка зубаўрачэбных кадраў», які быў змешчан у «Звяздзе» ад 12 мая, паведамляе, што пытанне аб арганізацыі ў БССР одантаалягічнага (зубаўрачэбнага) інстытута ў сучасны момант вырашаецца ў адпаведных саюзных і рэспубліканскіх урадавых установах.

## ПАРАД ФІЗКУЛЬТУРНІКАЎ У МЕНСКУ

Вышэйшы совет фізкультуры БССР праводзіць 30 чэрвеня ў Менску вялікі парад фізкультурнікаў, у якім прымуць удзел да 30.000 чал. Парад будзе мастацкі афармлен. Асноўнае ў афармленні параду — паказ спартыўнай тэхнікі ў руху.

## РЭСПУБЛІКАНСКІ РОЗЫГРЫШ ПЯРШЫНСТВА ПА ФУТБОЛУ

Пачынаецца рэспубліканскі розыгрыш першынства па футболу. 6 чэрвеня сустракаюцца каманды другой групы гарадоў. У гэты дзень іграюць Полацк з Оршай, Магілеў са Слуцкам і Жлобін з Мазырам. Сустрэчы адбудуцца ў Полацку, Магілеве і Жлобіне. 8 чэрвеня ў Менску сустрэнуцца каманды Заслаўля і Дзяржынска.

9 чэрвеня ў Менску пачынаецца розыгрыш каманд першай групы гарадоў — Менска, Віцебска, Гомеля і Бабруйска — па кругавой сістэме. Сістэма розыгрышу для другой групы — алімпійская (праіграўшы выбывае).

## ЗДАРЭННІ

*** Мужы-хуліганы.** Рабочы арцелі «Чырвоны золак» у Менску М. А. Русецкі з'явіўся на кватэру да сваёй былой жонкі А. Русецкай і пачаў хуліганіць. Русецкі зламаў аконную раму, дзверы ў калідоры, разбіў гаршкі з кветкамі і выгнаў з дому маці Русецкай і дзіця. Хуліган арыштован і прыцягваецца да судовай адказнасці.

Таксама арыштован і прыцягваецца да судовай адказнасці за хуліганства і сістэматычнае збіванне сваёй жонкі экспедытар таварнай станцыі Д. Л. Паныш, які мае ўжо некалькі судзімасцей за хуліганства.

## ПАВЕДАМЛЕННІ

Сёння, 4 чэрвеня, у 7 гадзін вечара, у Доме партактыва (вялікая зала) адбудзецца для партыйнага і комсамольскага актыва г. Менска даклад народнага артыста рэспублікі тав. В. Э. Мейерхольда на тэму: **«Творчы шлях і перспектывы развіцця нашага тэатра».**

Запрашаюцца работнікі мастацтва, літаратуры і настаўнікі гор. Менска.

Білеты — у горрайкомах КП(б)Б.

★

5 чэрвеня, у 8 гадзін вечара, у Доме партактыва (вялікая зала) склікаецца агульнагарадская нарада сакратароў парткомаў і парторгаў пярвічных партарганізацый па пытаннях:

1) Аб ходзе выканання дырэктыў ЦК КП(б)Б — аб парадку ўзымання членскіх партыйных узносаў.
2) Аб вучобе сакратароў парткомаў.
3) Аб фізкультурным свяце.

★

4 чэрвеня, у памяшканні клуба працаветы (Комуністычная, 19), у 6 гадзін вечара, адбудзецца нарада трыкутнікаў Варашылаўскага раёна.

★

4 чэрвеня, у 8 гадзін вечара, у памяшканні райпартгабінета Кагановіцкага РК КП(б)Б (Дом урада, левае крыло, 5 паверх, пакой 501) для агітатараў прадпрыемстваў і ўстаноў Кагановіцкага раёна адбудзецца лекцыя прафесара Гофмана на тему «Сацыялізм і сям'я» (у сувязі з праектам пастановы ЦВК і СНК СССР).

## ПАПРАЎКА

Ва ўчарашнім нумары «Звязды» ў перадавым артыкуле «Разгорнем спаборніцтва цагельнікаў» упамінаецца **гомельскі завод № 3. Трэба чытаць: «гомельскі завод № 6».**

Адказны рэдактар Н. СТЭРНІН.



У Калонным зале Дома саюзаў адбываецца трэці маскоўскі міжнародны шахматны турнір. У першым туры сустрэліся Флор—Румін, Капабланка — Кан, Рагозін — Эліскасэс, Левенфіш — Ліліенталь і Ласкер—Батвінік. НА ЗДЫМКУ — (злева) чэмпіён СССР — гросмейстэр Міхаіл Батвінік грае з былым чэмпіёнам свету Ласкерам.

Фото Кудаярава (Саюзфото).

### 3-ці МАСКОЎСКІ МІЖНАРОДНЫ ШАХМАТНЫ ТУРНІР

## 14-ы тур

МАСКВА, 3 чэрвеня. (БЕЛТА). 2 чэрвеня ў 14 туры добрую партыю даў гросмейстэр Флор супроць экс-чэмпіёна свету д-ра Ласкера.

Развіваючы сваё наступленне, Флор уварваўся ферзем і сланамі ў тыл чорных. Ласкер здаўся на 27-м ходзе.

Партыя Кан—Батвінік к перапынку была адкладзена з большымі шансамі на выйгрыш у чэмпіёна СССР.

Астатнія тры партыі — Капабланка—Левенфіш, Румін — Рагозін, Эліскасэс—Ліліенталь закончыліся ўнічыю.

Пасля перапынку даігрывалася партыя **Кан — Батвінік.** Не маючы ніякай кампенсацыі супроць двух лішніх пешак чэмпіёна СССР, маскоўскі майстар на 48-м ходзе здаў сваю безнадзейную партыю.

***

Пасля 14 тураў Капабланка мае 10 ачкоў, Батвінік — 9, Рагозін, Флор і Ліліенталь — па 7, Левенфіш і Эліскасэс — па 6,5, Ласкер і Кан — па 6 і Румін — 5.

3 чэрвеня ў 15 туры іграл Ласкер — Капабланка. Батвінік — Флор, Эліскасэс — Румін, Левенфіш — Рагозін і Ліліенталь — Кан.

## КАДРЫ ДА ЎБОРАЧНАЙ КАМПАНІІ

У БССР разгорнута шырокая сетка курсаў Наркамзема па падрыхтоўцы да ўборачнай кампаніі кадраў механізатараў сельскай гаспадаркі. Ужо выпушчана да 10.000 трактарыстаў і ільноцерабільшчыкаў. 2.800 чал. навучаецца на курсах трактарных механікаў, камбайнераў, машыністаў ільноапрацоўчых і складаных ільномалацільных машын і т. д. На працягу чэрвеня-ліпеня курсы падрыхтуюць 15.000 работнікаў масавых кваліфікацый — снопавязальшчыкаў, вагаўшчыкоў, ільномяльшчыкаў і інш.

## СУСТРЭЧА ТЭАТРА ІМЯ МЕЙЕРХОЛЬДА З РАБОТНІКАМІ МАСТАЦТВА МЕНСКА

Калектыў тэатра імя Мейерхольда сустраўся ўчора з работнікамі мастацтва гор. Менска. Глядзельная зала Белдзяржтэатра была запоўнена артыстамі, пісьменнікамі, мастакамі, кампазітарамі, скульптарамі і інш. Шумнымі апладысментамі спаткалі прысутныя з'яўленне на сцэне за сталом прэзідыума народнага артыста рэспублікі **Всевалада Эмільевіча Мейерхольда** і артыстаў яго тэатра.

Цёпла і шчыра віталі Всевалада Эмільевіча ад імя работнікаў тэатральнага мастацтва сталіцы БССР мастацкі кіраўнік БДТ1 тав. Літвінаў і народны артыст рэспублікі тав. Рафальскі. У адказ на прывітанні Всевалад Эмільевіч выказаў гарачую падзяку работнікам мастацтва за цёплую прыяцельскую сустрэчу.

Потым В. Э. Мейерхольду быў задан рад пытанняў, звязаных з развіццём тэатра яго імя, у прыватнасці з пастаноўкамі тэатра ў Менску.

Пасля ўрачыстай часткі ўдзельнікі сустрэчы праглядзелі самадзейнае мастацтва рабочых свінсоўгасаў БССР.

## ПАЛЯПШЭННЕ АБСЛУГОЎВАННЯ ПАСАЖЫРАЎ

Заўтра ў Маскве адкрываецца склікаемая кіраўніцтвам Маскоўска-Беларуска-Балтыцкага чыгуначнага нарада па абслугоўванню пасажыраў. Сёння на нараду выязджае дэлегацыя менскага чыгуначнага вузла ў складзе парторга вузла тав. Каждана, начальніка пасажырскай станцыі тав. Нікалаеня, дырэктара буфета вакзала тав. Пракаповіча, білетнага касіра тав. Язэпчык і інш.

За апошні час на станцыі Менск прароблена значная работа па лепшаму абслугоўванню пасажыраў. Арганізован кругласутачны продаж білетаў па ўсіх кірунках, білетныя касіры выязджаюць насустрач транзітным пасажырам і робяць адзнакі на іх білетах. З 1 чэрвеня ст. Менск арганізавала дастаўку пасажырскіх білетаў на дом. Білет можна заказаць на любы поезд і па тэлефону. З заўтрашняга дня на буйнейшых прадпрыемствах Менска арганізуецца продаж білетаў на ўсе прыгарадныя паязды.


Памяшканне Белдзяржтэатра | Гастролі дзяржаўнага тэатра імя МЕЙЕРХОЛЬДА

4 чэрвеня

А. С. Грыбаедаў

„Горе уму".

Пачатак у 8 г. вечара.

Білеты прадаюцца ў касе тэатра з 12 да 2 і з 5 да 8 г. вечара. Хто спозніцца, у глядзельную залу дапушчан не будзе.

| | |
|---|---|
| «Чырвоная горка» | Я ВЯРНУСЯ |
| «Пролетарый» | ЦЫРК |
| «Інтэрнацыянал» | КАНДУІТ |
| Дзіцячы гукавы кінотэатр | КАНДУІТ |
| «Спартак» | 2-я серыя МІС.МЕНД |

Згубленыя і украдзеныя дакументы лічыць несапраўднымі:

Саўко Я. М. — пашпарт; Чадзюк В. С. — профбілет; Богдан Я. А. — профбілет; Пікуе А. А. — профбілет; Дадацкі В. Я. — профбілет; Штукар В. Р. — профбілет; Гуд М. В. — профбілет; Грынько І. Г. — профбілет; Галубовіч Т. Р. — профбілет; Лепецкі А. М. — профбілет; Бараноўскі Г. В. — профбілет; Стасенка К. Д. — профбілет; Залікер Э. Э. — пашпарт; Смоліч Г. В.— пашпарт; Гудэ Х. Б. — пропуск на фабрыку «Кастрычнік»; Скубілаў А. Ф. — пашпарт; Васілеўская Е. С. — абавязацельства на мясапастаўкі на 1935—1936 г.г.; Гаранскі І. А. — пашпарт; Варывончык С. І. — праязны гадавы білет; Ліпкіна М. С. — пашпарт, Захаравіч Н. Б. — пашпарт; Крышкавец П. І. — пашпарт і вайсковы білет; Сухадольскі М. П. — пашпарт і вайсковы білет; Шарайка А. Н. — пашпарт; Бернштэйн Э. Х. пенсійная кніжка.

Народны суд Мазырскага ўчастка і раёна прапануе Пікуліку Уладзіміру Васільеву, 1883 г. нараджэння, раней працаваўшаму ў Мазырскім гортэатры мастаком, з'явіцца ў нарсуд гор. Мазыра, БССР, або паведаміць суду аб сваім месцазнаходжанні. Просьба да ўсіх устаноў, арганізацый і асоб, ведаючых аб месцы знаходжання Пікуліка, або аб яго смерці, паведаміць аб гэтым суду.

Народны суддзя КАВАЛЁВА.

Мясцком і калектыў работнікаў Наркамзема БССР выказваюць спачуванне работніку Наркамзема тав. ПРАЖОГА Е. Г. з прычыны пасцігшага яго гора смерці

БАЦЬКІ.

ВЫ ВЕДАЕЦЕ ШТО ТАКОЕ КЕТЧУП?

КЕТЧУП — гэта таматны соус, у склад якога ўваходзяць, апрача таматнага пюрэ, цукар, соль, дастыліраваны воцат, цыбуля, свежа працёртыя часнок, перац, гарчыца, карыца, гваздзіка, мускатны арэх, сельдэрэй, інбір і інш. спецы.




Кетчуп — прыемная, смачная і арыгінальная прыправа да мясных, рыбных, гародніх і мучністых блюд.

Цана бутэлькі ў 250 гр. 1 р. 60 кап., у 500 гр.—2 р. 25 к.

ПАТРАБУЙЦЕ КЕТЧУП заводаў Галоўкансерва ў фірменых магазінах Саюзканцэрсбыта і ў іншых прадуктовых магазінах.

ДАСТАЎКА ХЛЕБАБУЛАЧНЫХ ВЫРАБАЎ НА ДОМ

У мэтах лепшага абслугоўвання пакупнікоў наступныя магазіны хлебнай канторы Менгархарчгандля ПРЫМАЮЦЬ ЗАКАЗЫ на дастаўку хлебабулачных вырабаў на дом:

магазін № 102 — Суражская, 2, тэл. 25.667;
» № 108 — рог Совецкай і Свярдлоўскай, тэл. 23.046;
» № 109 — Совецкая, супроць Дома ўрада, тэл. 23.968;
» № 129 — 1-я Лекерта, 12, тэл. 23.750;
» № 131 — Ленінская, 42, тэл. 22.472;
» № 132 — Ленінская, 16, тэл. 24.996;
» № 133 — Ленінская, 5, тэл. № 23.861;
» № 135 — Інтэрнацыянальная, 7;
» № 139 — Няміга, 21;
» № 140 — Рог Комсамольскай і Рэвалюцыйнай, тэл. 23.853;
» № 143 — Рог Энгельса і Совецкай;
» № 165 — Ленінская, № 22, тэл. 25.967;

Прыём заказаў на дастаўку хлеба на дом праводзіцца ў любы час.

ДЫРЭКЦЫЯ ХЛЕБНАЙ КАНТОРЫ МЕНГАРХАРЧГАНДЛЯ.

Народнаму камісарыяту асветы БССР ПАТРЭБНЫ па пастаянную работу МАШЫНІСТКІ, добра ведаючыя беларускую і рускую мовы.

Згодна пастановы прэзідыума Барысаўскага лесдраўхімсаюза ад 25 мая 1936 г. Бярэзінская арцель «Судабудаўнік» ЛІКВІДУЕЦЦА

Усе прэтэнзіі, зацікаўленых асоб і ўстаноў прымаюцца ліквідкомам да 15 чэрвеня г. г., якія накіроўваць у м. Бярэзіно, гэтага-ж раёна.

ЛІКВІДКОМ.

ПРАДАЎЖАЕЦЦА ПАДПІСКА на 2-е паўгоддзе 1936 г. на ЖУРНАЛ „ИСКУССТВО"

ИЗОГИЗ КОГИЗ

Орган Маскоўскага абласнога саюза совецкіх мастакоў і скульптараў. 6 нумароў у год.

«Искусство» асвятляе на аснове марксіска-ленінскай тэорыі творчасць совецкіх і заходне-еўрапейскіх мастакоў, напрамкі і школы (жывапіс, скульптура і графіка).

«Искусство» аддае значнае месца крытычнаму і тэарэтычнаму аналізу выставак, творчасці асобных мастакоў, разбору асобных твораў.

Журнал разлічан на мастакоў, мастацтвазнаўцаў, выяўленчыя гурткі, слухачоў мастацкіх і навучальных устаноў.

Падпісная цана: на 6 мес.—27 руб. | Асобны нумар —9 руб.

Падпіска прымаецца аддзяленнямі, магазінамі, кіёскамі, упаўнаважанымі КОГІЗ'а, Саюздрукам і ўсюды на пошце, а таксама ў галоўнай канторы КОГІЗ'а — Масква, Марасейка, 7.

Беларускі Дзяржаўны Інстытут праектавання аб'ектаў прамысловага і грамадзянскага будаўніцтва, з'ёмкі і планіроўкі гарадоў — „БЕЛДЗЯРЖПРАЕКТ"

— даводзіць да ведама ўсіх гаспадарчых арганізацый БССР, што прыём заказаў і заключэнне дагавораў на праектаванне аб'екта будаўніцтва 1937 года праводзіцца Белдзяржпраектам да 15 ліпеня 1936 г.

Заказы, паступіўшыя пазней гэтага тэрміну, не будуць прымацца да выканання або будуць выконвацца ў няпланавым парадку з адпаведным аддаленнем тэрміну прадстаўлення праектаў.

ДЫРЭКЦЫЯ.

На падставе пастановы прэзідыума праўлення Белкаапсаюза ад 28 красавіка за № 398 Віцебская міжрайбаза Белкаапсаюза ЛІКВІДУЕЦЦА

Усе прэтэнзіі да гэтай базы прымаюцца ліквідкомам да 15 чэрвеня г. г.; пасля гэтага тэрміну ніякія прэтэнзіі прымацца не будуць.

Адрас ліквідкома: г. Віцебск, Ардлоўская, 36.

ЛІКВІДКОМ.

Друкарні „ЗВЯЗДЫ" ПАТРЭБНЫ вучні-лінатыпісты, падсобныя рабочыя ў лінатыпны цэх і рабочыя ў ратацыйны цэх

Зварачацца: Совецкая, 63, 2-і паверх.

Аддзел кадраў Цэнтральнага кіраўніцтва народнагаспадарчага ўчоту абвяшчае АСЕННІ ПРЫЕМ студэнтаў

1) У МАСКОЎСКІ ІНСТЫТУТ НАРГАСУЧОТУ (В. Строченовский пер. 18);
2) у ВАРОНЕЖСКІ ІНСТЫТУТ НАРГАСУЧОТУ (г. Воронеж, ул. Фридриха Энгельса, 5);
3) у факультэты наргасучоту пры планавых інстытутах, інстытутах народнай гаспадаркі і дзяржаўных універсітэтах у Менску, Харкаве, Новасібірску, Самаркандзе, Баку, Тіфлісе.

Інстытуты і факультэты наргасучоту рыхтуюць высокакваліфікаваных эканамістаў наргасучоту для работы ў сістэме ЦУНГУ Дзяржплана СССР.

Прыём заяў з 1/VII па 1/VIII г. г.

Іспыты — з 1 па 20/VIII г.г.

Заняткі пачынаюцца 1 верасня.

Парадак падачы заяў і праграма іспытаў агульныя для ўсіх социяльна-эканамічных ВНУ.

Стыпендыяй забяспечваюцца 80 проц. студэнтаў. Іншагароднія забяспечваюцца інтэрнатам.

Выезд на іспыты па выкліку інстытута або факультэта.

Беларускі дзяржаўны політэхнічны інстытут абвяшчае НАБОР на 1936-37 навучальны год.

на агульнатэхнічны факультэт

Інстытут рыхтуе інжынераў па наступных спецыяльнасцях:
1. Інжынераў-будаўнікоў па арганізацыі вытворчасці будаўнічых работ.
2. Інжынераў-будаўнікоў па ацяпленню, вентыляцыі і цеплафікацыі.
3. Інжынераў-тэхнолагаў-механікаў.
4. Інжынераў-гідратэхнікаў-меліяратараў.
5. Горных інжынераў па торфу.
6. Інжынераў-хімікаў-тэхнолагаў сілікатнай прамысловасці.
7. Інжынераў-хімікаў-тэхнолагаў брадзільнай прамысловасці.

У інстытут прымаюцца грамадзяне ад 17 да 35 год, маючыя закончаную сярэднюю асвету, або атрымаўшыя атэстат аб сканчэнні сярэдняй школы ў парадку экстэрнату.

Паступіўшыя ў інстытут падлягаюць іспытам па ўстаноўленай праграме.

Прыём заяў аб залічэнні праводзіцца з 1 ліпеня па 1 жніўня.

Іспыты — з 1 па 20 жніўня.

Да заявы неабходна прыкласці: падрабязную аўтабіяграфію; атэстат аб сканчэнні сярэдняй навучальнай установы (у арыгінале); пашпарт (прад'яўляецца асабіста); пасведчанне лекавай установы аб стане здароўя, не перашкаджаючага паступленню на адпаведны факультэт; дзве фотакарткі з подпісам, засведчаныя дзяржустановамі.

Студэнты забяспечваюцца стыпендыяй, згодна існуючых правіл.

Іншагароднія забяспечваюцца інтэрнатам. Сем'і студэнтаў жыллёвай не забяспечваюцца.

Дакументы накіроўваць па адрасу: г. Менск, Барысаўскі тракт, 55.а, дырэктару Беларускага політэхнічнага інстытута.

ДЫРЭКЦЫЯ ІНСТЫТУТА.

Полацкі лесатэхнічны тэхнікум, які рыхтуе тэхнікаў-механізатараў і тэхнікаў-лесаводаў, абвяшчае НАБОР на першы курс аддзялення механізацыі лесазагатовак — 60 чал. і лесаводчае — 60 чал.

Прыём заяў да 10 жніўня ў канцэлярыі тэхнікума (г. Полацк, вул. імя Фрунзе).

Прыёмныя іспыты праводзяцца 15 і 20 жніўня па беларускай і рускай мовах, гісторыі, матэматыцы, фізіцы і хіміі.

Да заяў патрэбна прыкласці дакументы аб асвеце, метрычны выпіс, аб здароўі, анкету (якую можна атрымаць у тэхнікуме), 2 фотакарткі і на 40 кап. паштовых марак.

Пры тэхнікуме ёсць інтэрнат, сталовая. Размер стыпендыі па паспяховасці — ад 57 руб. і вышэй.

Дырэктар лесатэхнікума ВЯЛОВІЧ.


Тыраж 90550 экз. Друкарня газеты «Звязда», Менск, Совецкая, 63. Уп. Галоўлітбела № К—99